

ЯК ЖЫВЕ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМ»
8-9

АСЦЯРОЖНА: НЕБЯСПЕЧНАЯ ФЛОРА
12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 ЧЭРВЕНЯ 2021 г. СУБОТА № 110 (29479)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Мы ўсе бачым і разумеем, якая вядзецца магутная інфармацыйная, гібрыдная вайна, разгорнута самая сапраўдная ідэалагічная вайна. Тым не менш людзі праявілі сапраўдны патрыятызм, грамадзянскасць, даючы адпор тым, хто спрабаваў і працягвае спрабаваць захапіць нашу інфармацыйную прастору. Аднак нам трэба будзе яшчэ больш зрабіць. Сёння як ніколі важна паказваць тое пазітыўнае, што адбываецца ў краіне, тое, што ствараецца, што будуецца, самаадданую працу людзей».*

# Творчасць як самазанятасць



У Касцюковіцкім доме рамёстваў працуюць два разьбяры па дрэве, якія любяць выразаць і жывёл, і лыжкі. Адзін з іх на гэтым здымку — шасцідзесяцігадовы Сяргей БЛАГУШКА. Былы заатэхнік, ён па стане здароўя не можа цяпер працаваць па спецыяльнасці, але, дзякуючы лёсу (спадзяюся, шчасліваму), стаў знакамітым у галіне народнага мастацтва. Сяргей захапіўся разьбой драўляных лыжак для гаспадынь, свае вырабы аздабляў геаметрычнай вытанчанай разьбой, таму яго заўважылі і запрасілі ў Дом рамёстваў. Менавіта тут напоўніцу майстар стаў адкрываць свой творчы патэнцыял і самабытнасць — выразаць складаныя фігуры дзікіх жывёл, якія на святочных кірмашах і фестывалях заўсёды прывабілі гледачоў. За дваццаць гадоў Сяргей Аляксеевіч стаў карыфеем разьбярства Магілёўшчыны і па-ранейшаму працуе ў стылі інсітнага мастацтва.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб развіцці «Вялікага каменя».**
- Гарачыя лініі КДК па пытаннях уступнай кампаніі адкрыты ў Мінску і абласных цэнтрах.
- **Мабільныя брыгады МТЗ будуць дапамагаць рамантаваць тэхніку падчас масавых палявых работ.**
- Міжнародная федэрацыя хакея паказала дызайн медалёў чэмпіянату свету — 2022.



- **Цэнтральная гарбальніца Брэста пачала паэтапны пераход да штатнага рэжыму работы.**

ISSN 1990 — 763X

Нашы людзі

## ВЫСОКАЕ — ГОРАД ВЫНАХОДНІКАЎ

**Выкладчыкі і навучэнцы сельскагаспадарчага каледжа ствараюць тэхнічныя ноу-хау**

**У Высокаўскім дзяржаўным сельскагаспадарчым каледжы працуюць сапраўдныя рацыяналізатары і вынаходнікі. Іх работы не раз адзначаліся на выставах рэспубліканскага ўзроўню і, галоўнае, знаходзілі прымяненне на практыцы. А самай вялікай узнагародай для выкладчыкаў становяцца водгукі былых выпускнікоў, якія гавораць, што праз гады на сваёй вытворчасці ўкаранілі нешта з прыдуманага разам у вучэбных цэхах і лабараторыях.**

### СНЕГАХОД І РОВАР-ПАДМЯТАЛЬШЧЫК

Выкладчык з 38-гадовым стажам Валерый ЮНЧЫЦ адзначае, што навучэнцы, якія займаліся такой тэхнічнай творчасцю, становяцца спецыялістамі з асаблівым складам мыслення. Яны не адчуваюць сябе бездапаможнымі пры сутыкненні з любой праблемай, нешта прыдумваюць, здзяйсняюць маленькае адкрыццё альбо вынаходніцтва. Паводле яго перакананя, ёсць падлеткі з прыроджаным інжынерным складам розуму, але, каб яго развіць, трэба пакруціць рукамі гэтыя гайкі, нешта скласці са старых матацыклаў ды мапедаў, якія звычайна прыносяцца са звалкі.

СТАР. 7



Валерый ЮНЧЫЦ з бульбасаджалкай.

Я зноў выбіраю «Звязду»

## «ГАЗЕТА НЕ ГУБЛЯЕ АДМЕТНАСЦІ І Ў ВЕК ІНТЭРНЭТУ»

***Дырэктар філіяла «Навагрудскія Дары» ААТ «Лідскі малочна-кансервавы камбінат» Аляксандр БУЛАК:***



— Не адно дзесяцігоддзе мяне суправаджае па жыцці найстарэйшая газета краіны. Ведаю, што не так даўно «Звязда» святкавала стагадовы юбілей. Гэта азначае, што ў выдання ёсць моц, непаўторная асаблівасць. Яно не губляе адметнасць і ў сучасных умовах, у век інтэрнэту. Бо друкаванае слова ўспрымаецца ўсё ж такі інакш, больш грунтоўна.

Дарэчы, сустракацца з карэспандэнтамі «Звязды» мне даводзілася часта. І падчас работы ў сельгаспрадпрыемстве, інспекцыі прыродных рэсурсаў, Навагрудскім і Іўеўскім райвыканкамах. Вось і зусім нядаўна на старонках газеты надрукаваны вялікі артыкул аб рабоце нашага прадпрыемства «Навагрудскія Дары».

Увогуле, выданне адпавядае тым запытам, якія стаяць перад грамадствам краіны. Такая газета вельмі патрэбна Беларусі.

Нягледзячы на такі салідны ўзрост, «Звязда» цікавая для любой узроставай катэгорыі. Відавочна, што ідзе вельмі важная падпітка выдання маладымі кадрамі, якія пішуць матэрыялы з улікам патрэб часу. Наогул, тэмы самыя разнастайныя. Вялікая ўвага ўдзяляецца экалагічным праблемам, гістарычным падзеям, турыстычнаму патэнцыялу краіны. Многа слушных парад пра здароўе. Цяпер такія артыкулы вельмі карысныя і запатрабаваныя. Добра, што газета адгукаецца і на пісьмы сваіх чытачоў, якія дасылаюць розныя цікавыя гісторыі. З задавальненнем чытаю рубрыку «Постаці», у якой расказваецца пра вядомых людзей, іх жыццёвы лёс. Спадзяюся, што і надалей «Звязда» будзе адпавядаць свайму высокаму статусу рэспубліканскага выдання і радаваць чытачоў цікавымі і актуальнымі артыкуламі.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы павінны ісці да дэбюракратызацыі ўсіх сістэм, схем, што дзейнічаюць у краіне»

**У Палацы Незалежнасці прайшла нарада па пытаннях прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці. Пытанні, вынесеныя на разгляд Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку, ахоплівалі шырокі спектр эканамічных і грамадскіх адносін.**

«Нам трэба будзе абмеркаваць пласт фундаментальных аспектаў прававога рэгулявання, якія закрануць кожнага без выключэння. І не толькі, я ўпэўнены, грамадзян Рэспублікі Беларусь. Таму любыя навацыі павінны быць як мага больш выверанымі і прадуманы, а таксама адказваць нашым каштоўнасцям, прынцыпам і не ствараць якіх-небудзь пагроз», — сказаў кіраўнік краіны.

Першае, самае аб'ёмнае пытанне нарады, па яго словах, датычыцца прапанаваных карэкціровак Грамадзянскага кодэкса, які, па сутнасці, уяўляе сабой эканамічную Канстытуцыю (прававую аснову ўсіх гаспадарчых адносін).

Як падкрэсліў Прэзідэнт, дзеючы кодэкс сістэмна не пераглядаўся з дня яго прыняцця, а гэта было яшчэ ў мінулым стагоддзі.

«Як мне дакладваюць, работа над праектам вялася не адзін год з прыцягненнем усіх прадстаўнікоў грамадства. Падрыхтаваны значны аб'ём правак, якія закранаюць многія сферы, аж да працоўнай і банкаўскай сфер. Найбольшы блок змяненняў закране гаспадарчую дзейнасць і простых грамадзян. Гэта ўкараненне пакуль новых для нас (але тых, што працуюць у іншых дзяржавах) інстытутаў, а таксама паляпшэнне кодэкса з улікам рэальнага жыцця», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў: хацеў бы яшчэ раз пераканацца ў тым, што вызначаныя кірункі развіцця грамадзянскага заканадаўства адпавядаюць дзяржаўнай палітыцы.

«Па-першае, наколькі прапанаваныя падыходы адказваюць бягучым і, галоўнае, перспектыўным патрэбам краіны, грамадства, бізнесу і грамадзян? Па-другое, як улічаны вопыт такога рэгулявання ў іншых дзяржавах, асабліва з якімі ў нас шырокая дагаворна-прававая база (напрыклад, ЕАЭС)? Па-трэцяе, якія навацыі з'явяцца ў нашай краіне, калі мы замацуем іх у кодэксе? Наколькі мы (асабліва суб'екты гаспадарання і людзі) гатовыя да іх? ***Памятаеце, я заўсёды казаў: «Змены, Змены, Змены». Я гатовы да змен, а ці гатовы вы, ці гатова грамадства? Ці запатрабаваны гэтыя змены? Ці мы «нацягваем» іх штучна, чаго рабіць нельга»,*** — задаў пытанні прысутным на нарадзе чыноўнікам Прэзідэнт.

Яшчэ адзін кірунак для абмеркавання на сустрэчы датычыўся ўдасканалення інстытута адміністрацыйных працэдур, ад якасці рэгулявання якога залежыць апеляцыйнасць іх аказання, інвестыцыйная прывабнасць краіны, павелічэнне даходнай часткі бюджэту і развіццё эканомікі.

«Але галоўнае, адміністрацыйныя працэдуры — гэта пункт судакранання дзяржавы і грамадства. І эфектыўнасць такога ўзаемадзеяння шмат у чым уплывае на настрой людзей і давер да дзяржавы і ўлады ў цэлым. Таму ***рух у бок поўнай інфармацыйнай даступнасці адміністрацыйных працэдур і іх аказання ў электронным выглядзе павінен адбывацца хутчэй.*** Нават нашы партнёры па Еўразійскім эканамічным саюзе прасунуліся ў гэтым значна далей», — заўважыў кіраўнік краіны.

Паводле яго слоў, вынесены на абмеркаванне праект указа ўстанаўлівае шматузроўневую сістэму рэгулявання. Прынцып і асноўныя падыходы вызначаюцца Прэзідэнтам, пералік адміністрацыйных працэдур — урадам, іх канкрэтная рэгламентацыя — галіновымі і функцыянальнымі дзяржаўнымі органамі.

«Я сказаў, што гэта вельмі важна, і прашу далажыць. Па-першае, ці будзе эфектыўнай такая сістэма? Ці не прывядзе яна да звышфармалізму і, што вельмі страшна, бюракратыі ці кручкатворства на ведамасным і мясцовым узроўнях?» — запытаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заявіў, што гэтага дапусціць ні ў якім разе нельга.

***«Мы павінны ісці да дэбюракратызацыі ўсіх сістэм, схем, што дзейнічаюць у краіне, — гэта галоўнае. Добрыя часам законы і заканадаўчыя акты ў нас тонуць у бюракратызме, залішнім узгадненні, хаджэнні па інстанцыях і гэтак далей. Забыліся пра адно акно»,*** — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ Прэзідэнт пацікавіўся: якім чынам плануецца выбудаваць электроннае ўзаемадзеянне паміж органамі ўлады і суб'ектамі гаспадарання? Ці дазволіць лічбавізацыя скараціць выдаткі і не дапусціць карупцыйных перадумоў?

«Папярэджваю: тут ***не павінна быць работы ў даніну модзе: «Ах, лічбавізацыя, ах, камп'ютарызацыя, ах, айфончыкі ў руках...»*** Гэта ўсё добра, калі на карысць і калі разумеюць нашы людзі, а не асобныя 15—20 працэнтаў насельніцтва, і калі людзі гэта ўспрымаюць. Бегчы трэба не спяшаючыся, але не спазняцца», — дадаў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яму самому даводзіцца шмат займацца кантролем за асноўнымі нарматыўнымі дакументамі і папрасіў дапамогі ў старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай.

«Прыйдзецца Савету Рэспублікі і вам асабіста гэтым заняцца, каб мы, не дай Бог, не дапусцілі нейкіх ляпаў ці хтосьці не прапхнуў у значнае заканадаўства тое, што сёння жыццём не запатрабавана. У Савеце Рэспублікі вопытныя людзі ад вытворчасці», — сказаў кіраўнік краіны.

Па яго словах, неабходна стварыць каманду юрыстаў, філосафаў і прававедаў, якія будуць працаваць пры верхняй палаце парламента і прагладаць дакументы на «жыццяздольнасць».

Міністр эканомікі Аляксандр Чарвякоў паведаміў, што ў Грамадзянскі кодэкс прапануецца ўнесці шэраг навацый. Яны прадугледжваюць нормы, якія сёння апрабаваны ў асобных сферах, і іх неабходна ўнесці ў гэты звод законаў. Важна таксама гарманізаваць шэраг нормаў з партнёрамі па ЕАЭС і ўкараніць нормы з улікам практыкі іх правапрымянення.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Каментарый у тэму

**Міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** расказаў журналістам, што Прэзідэнт падтрымаў праект указа па ўдасканаленні адміністрацыйных працэдур. Па словах кіраўніка ведамства, дакумент — гэта толькі першы крок да далейшай вялікай работы.

«Сёння мы навялі парадак з працэдурамі, ачысцілі ад лішніх, дублюючых працэдур, скампанавалі іх дакладна і зразумела. І самае галоўнае — мы падрыхтавалі пералік, рэестр працэдур», — сказаў міністр эканомікі.

Рэестр, як ён паведаміў, уяўляе сабой лічбавую пляцоўку для прадпрыемстваў, куды яны могуць накіраваць заяву, і яна будзе аўтаматычна рухацца далей. Рэестр ужо працуе ў тэставым рэжыме. Яго прэзентуюць у найбліжэйшы час.

Міністр сцвярджае, што пералік адміністрацыйных працэдур застанецца на кантролі ўрада, каб магчыма было хутка ўносіць карэктывы.

«Мы пераходзім ад пераліку да электроннай пляцоўкі, дзе будзе знаходзіцца інфармацыйная база ўсіх працэдур. Прадпрыемствы, заходзячы на гэту пляцоўку, атрымаюць максімум інфармацыі па любой працэдуры, і гэта пляцоўка будзе адным акном для падачы заявы. А далей мы апрацоўваем трэці ўзровень, калі ў кожнага рэгулятара будзе свой электронны прадукт, дзе будзе ажыццяўляцца канкрэтная працэдура», — расказаў міністр эканомікі.

Задача чыноўнікаў да студзеня 2024 года — завяршыць гэту работу.

Таксама, як дадаў Аляксандр Чарвякоў, кіраўнік краіны даручыў кардынальна перагледзець і скараціць пералік адміністрацыйных паслуг.

«Гэту работу мы будзем рабіць з прадпрыемствамі, прадпрымальнікамі, бізнес-саюзамі для таго, каб максімальна скараціць адміністрацыйны ціск. Размова ідзе не толькі пра прыватны сектар, але і дзяржаўны. Адміністрацыйнымі паслугамі карыстаюцца ўсе: і прыватныя, і замежныя прадпрыемствы. Кіраўнік краіны падкрэсліў, што дадзеная работа павінна праводзіцца не толькі чыноўнікамі, але і бізнес-супольнасцю, парламентарыямі. Работу мы будзем актыўна ў найбліжэйшы час разгортваць», — дадаў Аляксандр Чарвякоў.

**Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі,** у размове з журналістамі акцэнтаваў увагу, што цяперашняя карэкціроўка Грамадзянскага кодэкса самая маштабная з часу яго прыняцця. На працягу апошніх двух гадоў рыхтаваліся прапановы па абнаўленні зводу законаў, а сёння яны былі прадстаўлены кіраўніку краіны.

Напрыклад, прапануецца замацаваць норму, паводле якой некаторыя віды юрыдычных асоб могуць дзейнічаць на аснове тыпавога статусу, зацверджанага ўрадам. Адносна здзелак непаўналетніх асоб з 14 да 18 гадоў плануюць рэгламентаваць, што дастаткова для заключэння здзелкі згоды аднаго заканадаўчага прадстаўніка падлетка.

Няма таксама ў сучасных нормах, як расказаў міністр, адназначнага разумення, што такое дробная бытавая здзелка, якую могуць ажыццяўляць непаўналетнія.

«У гэтай сувязі ўводзіцца дакладная норма — верхняя мяжа для дробнай здзелкі памерам у тры базавыя велічыні», — канстатаваў міністр юстыцыі.

Будзе скасавана верхняя мяжа тэрміну дзеяння даверанасці. Бакі самі змогуць яго вызначаць.

«Трэба адзначыць, што ўводзіцца артыкул, які прадугледжвае дадатковую ахову выявы грамадзяніна. Гэты артыкул прадугледжвае, што выява, фатаграфія грамадзяніна не можа распаўсюджвацца, перадавацца без згоды самога грамадзяніна. За выключэннем фатаграфіі ў агульнадаступным месцы», — сказаў Алег Сліжэўскі.

Па словах міністра, агульны дух навацый Грамадзянскага кодэкса — зрабіць закон больш сучасным, прыстасаваць пад эканамічныя і грамадскія адносіны.

«Многія змены, якія ўтрымлівае кодэкс, накіраваны на спрашчэнне парадку арганізацыі, вядзення бізнесу для большага разумення і адназначнага ўспрыняцця нормаў Грамадзянскага кодэкса», — рэзюмаваў міністр.

Прэзідэнт даў згоду на ўнясенне праекта дакумента ў парламент.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Еўрасаюзе з 1 ліпеня ўводзяцца COVID-пашпарты



Еўрапейскі парламент зацвердзіў увядзенне ў ЕС лічбавага COVID-сертыфіката. Новы дакумент вызваліць трымальнікаў ад неабходнасці рабіць дадатковыя тэсты і адбываць каранцін пры перамяшчэнні паміж краінамі Еўрасаюза. Медыкі ў любой краіне ЕС змогуць ставіць віртуальныя штампы аб прышчэпках і тэстах на ўнутраны лічбавы ковідны пашпарт. А ўсе астатнія дзяржавы саюза з гэтага часу абавязаны будуць прымаць яго. Гэта бясплатны сертыфікат для ўсіх грамадзян Еўрасаюза, яны змогуць атрымаць яго альбо ў лічбавым, альбо ў раздрукаваным на паперы выглядзе. У ім будуць пазначаны даныя пра вакцынацыю альбо аб тэстах на ковід. Пра гэта заявіў дзяржсакратар пры МЗС Францыі па еўрапейскіх справах Клеман Бон. Ён растлумачыў, што гаворка пойдзе «аб усіх адобраных ЕМА вакцынах, якіх на дадзены момант чатыры». Гэта прэпараты кампаній Pfizer-BioNTech, Moderna, AstraZeneca і Johnson & Johnson. У астатніх выпадках для падарожжаў па ЕС людзям трэба будзе здаваць тэст на каранавірус. 1 чэрвеня дадзеную сістэму ўжо запусцілі Балгарыя, Чэхія, Данія, Германія, Грэцыя, Харватыя і Польшча.

## Пэдра Касцілья перамагае на прэзідэнцкіх выбарах у Перу



Прадстаўнік левырадыкальнай партыі «Вольнае Перу» Пэдра Касцілья атрымлівае перамогу на прэзідэнцкіх выбарах у краіне. Пра гэта сведчаць даныя, апублікаваныя Нацыянальным офісам выбарчых працэсаў (ЦВК) паўднёваамерыканскай рэспублікі па выніках апрацоўкі 100 працэнтаў пратаколаў другога тура галасавання, паведаміла ТАСС. Падлічана пры гэтым пакуль каля 99,2 % бюлетэняў. За Касцілья прагаласавала больш чым 8,8 мільёна выбаршчыкаў (амаль 50,2 %). Яго апанентку Кейку Фухіморы з правай партыі «Народная сіла» падтрымалі 8,73 мільёна выбаршчыкаў (49,8 %). Яна лідзіравала з невялікай перавагай з моманту пачатку падліку галасоў. Касцілья не прызнаваў паражэння і заклікаў прыхільнікаў захоўваць спакой, прапаноўваючы дачакацца завяршэння апрацоўкі бюлетэняў у сельскай мясцовасці. Пры гэтым прадстаўнікі левырадыкальнай партыі запатрабавалі ад ЦВК весці максімальна пільны падлік усіх галасоў. Абраны прэзідэнт Перу ўступіць на пасаду 28 ліпеня. Тэрмін яго паўнамоцтваў складае пяць гадоў.

## ESA адправіць арбітальны апарат да Венеры



Еўрапейскае касмічнае агенцтва (ESA) пацвердзіла адпраўку да Венеры арбітальнага апарата EnVision у пачатку 2030-х. Такое паведамленне змешчана на сайце агенцтва. Асноўная задача місіі — даследаваць паверхню планеты, атмасферу, геалагічны склад, структуру і гравітацыйнае поле. Для гэтых мэт на EnVision будзе размешчаны шырокі інструментарый — рэхалоты, спектрометры і радары. «Нас чакае новая эра ў даследаванні нашага найбліжэйшага, але невераградна адрознага суседа па Сонечнай сістэме», — заявіў дырэктар агенцтва па навуцы Гюнтэр Хасінгер. Раней амерыканскае аэракасмічнае агенцтва NASA заявіла аб вылучэнні сродкаў на дзве новыя місіі на Венеру — па 500 мільёнаў долараў на кожную. Іх пачатак намечаны на 2028—2030 гады. Галоўная мэта місій — высветліць, як атрымалася, што Венера, маючы столькі падобных характарыстык з Зямлёй, стала абсалютна непрыдатнай для жыцця планетай.

# Прэзідэнт прыняў адстаўку Віктара Шэймана

**Аляксандр Лукашэнка прыняў рапарт аб адстаўцы кіраўніка спраў Прэзідэнта Віктара Шэймана. Гэтае пытанне было абмеркавана падчас сустрэчы ў Палацы Незалежнасці, перадае прэс-служба кіраўніка краіны.**

«Ты шмат разоў пісаў рапарт аб сыходзе ў адстаўку. Я не згаджаўся з гэтым. Але я разумею, што калісьці час прыходзіць, табе хапіла ў жыцці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Віктар Шэйман мае вялікі жыццёвы вопыт і доўгі кар'ерны шлях: ад лейтэнанта, які прайшоў Афганістан, да генерал-палкоўніка.

«Я разумею, што і сям'я, і дзеці, і шматшмат яшчэ пытанняў. Таму я згодны з тваёй новай старонкай у жыцці, скажу так. Але вельмі б папрасіў не сыходзіць далёка (і наогул не адыходзіць ад дзяржавы) і падставіць плячо там, дзе гэта трэба будзе. Як ты заўсёды гэта рабіў, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Пакуль бы вельмі папрасіў узяць на сябе, як заўсёды было, Кубу, Венесуэлу і тыя «хвасты» ў Афрыцы, пакуль ты не перадаў ураду. Прашу гэта пакінуць за сабой, пакуль я не вызначу, хто будзе далей гэтым займацца. Ну і яшчэ раз кажу: далёка не сыходзь. Бачыш, якая сітуацыя вакол Беларусі. Не дай бог нам з табою яшчэ ўзяць аўтамат у рукі і абараняць краіну».

Ігар ПЕТРЫШЭНКА:

# «Зрабіць так, каб людзі з інваліднасцю не адчувалі ўшчамлення»

На базе Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта пад старшынствам намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі прайшло чарговае пасяджэнне Рэспубліканскага міжведамаснага савета па праблемах інвалідаў, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Удзельнікі разгледзелі пытанні па вырашэнні праблем людзей з інваліднасцю ў Брэсцкай вобласці, а таксама павышэння эфектыўнасці міжведамаснага ўзаемадзеяння пры стварэнні даступнага асяроддзя ў краіне і ажыццяўленні пастаяннага маніторынгу гэтай работы.

Да пачатку пасяджэння савета ўдзельнікі азнаёміліся з дзейнасцю ўніверсітэта, работай рэсурснага цэнтра інклюзіўнай адукацыі, а таксама з выставай вырабаў ручной работы, карцін людзей з інваліднасцю.

Віцэ-прэм'ера прыемна ўразіла: звычайныя студэнты, якія навучаюцца з хлопцамі з інваліднасцю, нават не ведаюць, што іх аднакурснікі асаблівыя.

— Гэта значыць, забяспечана камфортнае асяроддзе для сацыялізацыі такіх маладых людзей у студэнцкае жыццё. Яны атрымліваюць якасную, добрую адукацыю, дэманструюць належны ўзровень ведаў, здаюць нароўні з усімі экзамены — ніякіх патуранняў тут няма. Бо галоўная задача — каб яны потым маглі, як і ўсе, рэалізавацца ў прафесіі. Дарэчы, мы ўзялі для сябе яшчэ такі вектар, як садзейнічанне ў працаўладкаванні людзям з абмежаванымі магчымасцямі. Па выніках мінулага года ў гэтым кірунку значна прыраслі: у нас 68,8 тысячы такіх людзей працаўладкавана, — адзначыў Ігар Петрышэнка.

Ён канстатаваў, што ў нашай краіне 564,5 тысячы інвалідаў, у тым ліку 34,5 тысячы — дзеці да 18 гадоў. Для гэтай катэгорыі важна стварыць элементы сацыялізацыі, інклюзіўнага асяроддзя, каб яны маглі рэалізоўвацца і ў навучанні, і ў прафесіі.

— Далей будзем рухацца так, каб у нашых гарадах, на ўсіх інфраструктурных аб'ектах было ўсё, каб людзі з абмежаванымі магчымасцямі не адчувалі нейкага ўшчамлення, — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Наступнае пасяджэнне адбудзецца ў Віцебскай вобласці, каб на месцы выявіць недахопы ў рабоце і шукаць шляхі вырашэння канкрэтных праблем у рэгіёнах.

— Гэта комплексны падыход: важна паглядзець, як будуецца работа па ўсіх напрамках, у прыватнасці, як створана безбар'ернае асяроддзе, вырашаюцца іншыя пытанні людзей з інваліднасцю: аказанне медыцынскай, сацыяльнай дапамогі, сацыялізацыя ў адпаведнасці з медыцынскімі паказаннямі, — растлумачыў Ігар Петрышэнка.

Віцэ-прэм'ер таксама пазнаёміўся з работай прадпрыемства па вырабе абутку «Блік» Беларускага таварыства глухіх. Завяршылася работа савета цырымоніяй адкрыцця міжрэгіянальнай спартландыі «Вясёлыя старты» з удзелам людзей з інваліднасцю.

**Алена КРАВЕЦ.**

Даслоўна

# СЯБРОЎ НЕ ПАКІДАЮЦЬ

## Пасол Расіі запэўніў у падтрымцы ва ўмовах санкцый

**Расія прадоўжыць аказваць падтрымку Беларусі, у тым ліку ў выпадку ўвядзення дадатковых санкцый з боку Еўрапейскага саюза і іншых краін. Пра гэта заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Яўген ЛУК'ЯНАЎ, паведаміла БелТА.**

«Беларусь мы не пакінем, — падкрэсліў Яўген Лук'янаў. — Мы разумеем традыцыйную структуру эканомікі Беларусі, арыентаваную на экспарт, і я разумею, што менавіта таму санкцыі носяць такі кропкавы характар — каб падарваць менавіта гэтую частку экспартнай актыўнасці Беларусі і тым самым ударыць па фарміраванні бюджэту».

Дыпламат растлумачыў, што знешнегандлёвыя кантакты Беларусі і Расіі будуць інвентарызаваць «з улікам наступстваў ад уведзеных санкцый». Паводле яго слоў, больш дэталёвую інфармацыю па канкрэтных відах тавараў будуць вызначаць адпаведныя федэральныя ведамствы Расіі і іх партнёры ў Беларусі.

Сваё стаўленне да санкцый пасол праілюстраваў словамі міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея, сказанымі на адной з сустрэч з дыпламатамі: санкцыі ўводзяцца для таго, каб яны прывялі да галодных бунтаў. «Вось, уласна, уся ідэалогія, логіка і ўся германеўтыка гэтых санкцый», — заўважыў Яўген Лук'янаў.

Пры гэтым ён падкрэсліў незаконнасць увядзення санкцый. «Па вызначэнні міжнароднага права і практыкі яны незаконныя. Санкцыі такога роду супраць якой-небудзь краіны могуць быць выкарыстаны толькі па рашэнні Савета Бяспекі ААН», — звярнуў увагу Яўген Лук'янаў.

Парламенцкі дзённік

# НА СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ НАКІРАВАНА 338 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

**Пастаянная камісія па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў правяла пасяджэнне, дзе абмеркавалі праекты законаў аб выкананні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва і аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за 2020 год.**

**Людміла НІЖЭВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах,** адзначыла, што выкананне бюджэту адбывалася ва ўмовах эпідэміялагічнай сітуацыі, зніжэння сусветных цэн на асноўныя тавары, якія экспартуе краіна. Таксама негатыўнае ўздзеянне мела невыкананне асобных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця.

«Даходы бюджэту сфарміраваны ў аб'ёме 23,4 мільярда рублёў. Пры гэтым на працягу года адбылося ўдакладненне даходаў бюджэту на адзін мільярд рублёў. Істотны ўплыў аказалі даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці», — пералічыла дэпутат.

Па яе словах, калі паглядзець на структуру даходаў, то падатковыя займаюць каля 79 % і ў цэлым знізіліся неістотна — на 0,3 %. Даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці ўпалі больш значна — на 13 % у параўнанні з 2019 годам.

Як дадала дэпутат, асноўнае зніжэнне адбылося з-за скарачэння даходаў ад вывазных мытных пошлін нафты і нафтапрадуктаў, але страты ўдалося кампенсаваць дадатковымі даходамі, якія паступаюць ад вывазных мытных пошлін, звязаных з рэалізацыяй калійных угнаенняў. «Такім чынам, страты бюджэту ад вывазных мытных пошлін склалі 625 мільёнаў рублёў», — канстатавала Людміла Ніжэвіч.

Па яе словах, выкананне бюджэту склала за 2020 год 101 % удакладненага плана і 97 % першапачатковага плана, зацверджанага законам. Паўплывала пандэмія і на выкананне расходнай часткі бюджэту: расходы павялічаны да 26,4 мільярда рублёў.

«У структуры расходаў удзельная вага расходаў на сацыяльную сферу падрасла да 13 % да ВУП. Пры гэтым усе абавязкі па галінах эканомікі, узятыя на сябе Рэспублікай Беларусь, у 2020 годзе выкананы. Як і забяспечаны ўсе гарантыі, то-бок абавязкі па выкананні і пагашэнні знешняга і ўнутранага доўгу Рэспублікі Беларусь», — сказала старшыня Пастаяннай камісіі.

Яна адзначыла, што памер дэфіцыту бюджэту павялічаны адносна лічбаў, прынятых законам аб бюджэце, — да 2,2 мільярда рублёў.

Прысутны на пасяджэнні **міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЁРСТАЎ** у сваім дакладзе аб выкананні рэспубліканскага бюджэту летась паведаміў, што першапачаткова законам былі зацверджаны даходы ў памеры 24,4 мільярда рублёў і расходы ў 25,4 мільярда рублёў.

«Бюджэт 2020 года фарміраваўся, зыходзячы з базавага сцэнарыя развіцця эканомікі. Разам з тым яго выкананне ажыццяўлялася ва ўмовах пагаршэння ў пачатку года работы нафтахімічнага комплексу і запавольвання эканамічнай актыўнасці з-за эпідэміялагічнай сітуацыі. Гэта прывяло да рэзкага і значнага зніжэння даходаў у бюджэт», — сказаў міністр.

Паводле яго слоў, скарачэнне даходаў запатрабавала перагляду расходнай часткі бюджэту. Так, былі аптымізаваны расходы на суму 1,6 мільярда рублёў.

Юрый Селівёрстаў дадаў, што пандэмія запатрабавала павелічэння расходаў на медыцыну. Так, выдаткі на гэту галіну ў параўнанні з 2019 годам выраслі на 240 мільёнаў рублёў і склалі 1,2 мільярда рублёў. Работнікам аховы здароўя і сацработнікам, якія працавалі ў ачагах інфекцыі, выплачана дадаткова да асноўнага заробку 576 мільёнаў рублёў.

Міністр заявіў, што, нягледзячы на неспрыяльную эпідэміялагічную абстаноўку, бюджэт летась захаваў сваю сацыяльную накіраванасць, і выплаты адбыліся практычна без змен.

«Нейкага значнага прыросту з улікам мер чакаць не прыходзілася. Расходы рэспубліканскага бюджэту на адукацыю летась склалі 1,1 мільярда рублёў (на 103 мільёны больш, чым годам раней). На навуцы аб'ём расходаў склаў 326 мільёнаў рублёў (0,2 % да ВУП)», — сказаў міністр фінансаў.

Паводле яго слоў, працягнута фінансаванне праграмы сямейнага капіталу: у мінулым годзе на гэтыя мэты накіравана 338 мільёнаў рублёў, адкрыта 15,3 тысячы дэпазітных рахункаў. За пяць гадоў існавання сямейнага капіталу, дадаў Юрый Селівёрстаў, па гэтыя віды падтрымкі шматдзетных сямей звярнулася амаль 94 тысячы грамадзян.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Даступная вакцына

## З панядзелка прышчапіцца можна ва ўсіх бальніцах Мінска

**На базе адзінаццаці бальніц Мінска з 14 чэрвеня будзе арганізавана работа пунктаў вакцынацыі супраць інфекцыі COVID-19.**

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя, прайсці вакцынацыю супраць каранавіруса можна ў прышчэпачных пунктах, арганізаваных у бальніцах №№ 1, 2, 3, 4, 5, 6, 8, 10, 11, а таксама ў бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі і МНПЦ хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі.

Прышчэпачныя пункты створаны ў адпаведнасці з загадам Міністэрства аховы здароўя № 412 «Аб правядзенні вакцынацыі супраць COVID-19». Яны аснашчаны абсталяваннем, у тым ліку ўсім неабходным для захавання патрабаванняў «халадавага ланцуга».

У пунктах змогуць атрымаць прышчэпку ўсе ахвотныя — пры ўмове прад'яўлення дакумента, які сведчыць асобу. Падрабязная інфармацыя аб рабоце прышчэпачных пунктаў будзе размешчана ў агульнадаступных месцах і на сайтах устаноў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Анонс

# АДМЕТНАСЦІ І СУДАКРАНАННІ

**У Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пачынаецца досыць цікавы асветніцкі праект — «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры». Мяркуецца, што на працягу ўсяго 2021 года адбудзецца цэлы шэраг выставак, якія разам адкажуць на многія пытанні, звязаныя з лёсам нашай Айчыны і нашага народа.**

І першая выстаўка, якая пачне сваю работу 16 чэрвеня а 17-й гадзіне, у межах праекта складаецца з дзвюх частак — «Гісторыя» і «Культура». Першая паказвае лёсавызначальныя падзеі, асноўныя працэсы, этапы гістарычнага развіцця Беларусі (ад старажытных часоў да сучаснасці). Другая частка — «Культура» — адлюстроўвае асобныя тэмы, прысвечаныя адметнасцям самабытнай беларускай культуры.

Праект «Беларусь і беларусы. Гід па гісторыі і культуры» рэалізоўваецца ў адпаведнасці з грантам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у культуры на 2021 год. Партнёры праекта: Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Беларускае тэлеграфнае агенцтва, Дэпартамент па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Музей прыроды і экалогіі, Музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, вядомыя майстры фатаграфічнага мастацтва Ганна Кіпель, Анатоль Андрэеў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Жыллёвая нерухомасць

# ЦЭНЫ СТАБІЛЬНА ПАЎЗУЦЬ УНІЗ

## Але новабудоўлі даражэйшыя за кватэры з другаснага рынку

**Па словах дырэктара агенцтва нерухомасці «БелЦТН» і ганаровага старшыні ГА «Беларуская асацыяцыя «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА, чэрвень мы пражывём сапраўды таксама, як і май (у нас цяпер колькасць здзелак не максімальная, як бывала неаднойчы ў разгар вясновa-летняга сезона). Людзі пераканаюцца ў тым, што жыццё працягваецца, і вырашаць свае жыллёвыя пытанні пры неабходнасці трэба будзе тут і цяпер.**

Гэта трошкі лірыкі, а цяпер па сутнасці. Продажы кватэр у сталіцы скарачаюцца ўжо другі месяц запар. Але ёсць у гэтай навіны і станоўчы аспект: назіраецца тэндэнцыя, калі ў сувязі са значным пацяпленнем (усё ж такі лета) памяншаецца рызыка «падчапіць» каранавірус. Таму апошнім часам на другасны рынак жылля пачынаюць звяртаць увагу тыя, каму жыллё трэба было набываць яшчэ ўчора.

Тым не менш бягучы ўзровень попыту знаходзіцца каля сваіх сярэдніх значэнняў для пачатку лета. І ў цэлым, нягледзячы на не самы спрыяльны для рынку час, у 2021 годзе пакупнікі паводзілі сябе куды больш актыўна, чым у аналагічны перыяд мінулага года, калі ў разгар пандэміі набіралася за месяц крыху больш за 700 здзелак.

### ЦЭННІК УНІЗ, ПРАПАНОВА — ТУДЫ Ж

Калі ацэньваць стан рынку коратка — ён стабільны, цэны павольна, але ўпэўнена паўзуць уніз. Тэмп патаннення кватэр на дадзеным этапе невялікі — недзе да 1 % у месяц. Сапраўды, за апошнія два тыдні індэкс цэн другаснага рынку жылля ў Мінску знізіўся на 0,5 % і склаў 1244 долары за квадратны метр. Дзіўна, але сярэдняя цана кватэр у новабудоўлях сталіцы за гэты час нават нязначна вырасла і на сёння роўная 1292 долары за «квадрат». Разрыў паміж сярэднім узроўнем коштаў першаснага і другаснага рынку складае 48 долараў на карысць новабудоўляў. Сярэдняя цана квадратнага метра без уліку ўплыву новабудоўляў складае 1324 долары.

Прапанова на рынку кватэр сталіцы працягвае зніжацца: за апошнія сем дзён колькасць выстаўленых на продаж аб'ектаў зменшылася амаль на 1 %. Мацней за ўсё скарацілася колькасць чатырохпакаёвых кватэр. Колькасць трохпакаёвых за тыдзень практычна не змянілася. Прыкметней за ўсё скарацілася колькасць аб'яў аб продажы кватэр у Цэнтральным (мінус 6 %), Заводскім (мінус 6 %) і Ленінскім (мінус 5 %) раёнах.

Максімальную прапанову за мінулыя пяць гадоў мы назіралі летась у красавіку, калі адначасова прадавалася больш за 16 тысяч кватэр. Цяперашняе зніжэнне досыць хуткае — ужо прапануецца на продаж толькі 13 тысяч 360 кватэр.

### ПСІХАЛАГІЧНА ПРАДАЎЦЫ ЯШЧЭ НЕ ЗУСІМ ГАТОВЫЯ

Пакуль прадаўцы ў поўнай меры не ідуць на зніжэнне цэн, лічаць аналітыкі рынку жыллёвай нерухомасці. Выстаўляючы кватэру на продаж, яны арыентуюцца на лічбы, якія бачаць у інтэрнэце. «А там з 10 тысяч кватэр 80 % выстаўлены па завышанай цане. Тым не менш цэны рэальных здзелак зніжаюцца. Увесь мінулы год мы бачылі такі трэнд, і ён, у прынцыпе, захоўваецца. Але трэба разумець, што гэта здзелкі не па тых кватэрах, якія ўжо год вісяць у аб'явах, а па свежых варыянтах з адэкватнай цаной, якія былі выстаўлены ў маі», — кажа Мікалай Прасталупаў.

Разам з тым ніхто не сцвярджае, што рынак пачаў рэальна адназначна развiваться. Гэта даў аб сабе знаць адкладзены попыт. Літаральна



ўвесь мінулы год у нас быў вельмі нестабільны ў плане сацыяльных з'яў, і многія людзі адкладалі рашэнне жыллёвага пытання. Хтосьці вавяраў з вірусам, іншыя чакалі эканамічнага абвалу і наступнага зніжэння цэн. Але наступіў 2021 год, курс долара пакуль стабільны. У людзей наспела жаданне вырашыць жыллёвае пытанне, пакуль ёсць такая магчымасць. Таму што большасць купляе кватэру не таму, калі гэта выгадна, а калі патрэбна асобнае жыллё. Тыя нешматлікія пакупнікі, якія цяпер актыўнічаюць на рынку, вырашаюць сваё жыллёвае пытанне проста таму, што гэта неабходна.

### НЕ ЗУСІМ РЫНКАВЫЯ ФАКТАРЫ

Тут на першасным рынку жылля высвятляецца адзін цікавы фактар. Замежны забудоўшчык, які займаецца ўзвядзеннем дамоў жылога комплексу ў сталіцы, ужо цяпер мае каля 30 % аб'ёму прапаноў гатовых кватэр у новабудоўлях. Па словах нашага эксперта, у гэтай арганізацыі за апошні год «завіслі» тысячы і тысячы новых кватэр, якія досыць павольна прадаюцца ўжо на другасным рынку жылля. Нягледзячы на слабую цікавасць (на дадзеным этапе) да такога жылля, уласнік з усіх сіл «упіраецца» і не згаджаецца ісці на зніжкі. А мог бы. На думку Мікалая Прасталупава, у дадзенай сітуацыі была б вельмі дарэчы рэальная аднамоментавая зніжка ў памеры 10—15 %. Гэта значна ажывіла б рынак. А так патэнцыйныя пакупнікі бачаць перад сабой выключна дарагія кватэры, дзе квадратны метр прапаноўваецца па цане 1200 долараў з «хвастом». Тут трэба ўлічваць, што жыллё гэтае прапаноўваецца без аддзелкі, на якую трэба будзе выкласці яшчэ тысяч дваццаць долараў.

Да таго ж нават нешматпакаёвыя кватэры тут досыць прасторныя. Двухпакаёвыя кватэры агульнай плошчай 70 квадратных метраў, аднапакаёвыя — 50 «квадратаў». Такое жыллё разлічана выключна на багатых людзей, а такіх у нашай краіне становіцца ўсё менш і менш.

У сувязі са штучным стрымліваннем цэн гэтым забудоўшчыкам (і не толькі ім) атрымліваецца не зусім зразумелая сітуацыя, калі квадратныя метры ў навабудоўлях прадаюцца нават даражэй, чым кватэры на класічным другасным рынку жылля. А гэта няправільна, лічыць Мікалай Прасталупаў, гэта адкрыты дысбаланс рынку. Кватэры ў абжытых раёнах, з развітой інфраструктурай, з цалкам прымальным рамонтам, заўсёды прапаноўваліся даражэй, чым жыллё ў новых мікрараёнах, дзе неабходна як мінімум пяць гадоў, каб давесці пабудову да розуму. Бо патрэбна яшчэ пабудаваць аб'екты сацыяльнага значэння (дзіцячыя садкі, школы, крамы і іншыя).

Чаму такая сітуацыя склалася на рынку? Усё проста, кажа наш спікер, — на рынку няма здаровай канкурэнцыі. У Мінску не хапае сапраўды моцных забудоўшчыкаў, якія б змагаліся за кожнага пакупніка. У такім выпадку ўжо гатовае жыллё не будзе прастойваць гадамі...

Наш эксперт не чакае, што дынаміка зніжэння цэн будзе мацнець, бо 80 % здзелак на рынку альтэрнатыўныя. Прадаючы кватэру, людзі шукаюць жыллё наўзамен. Цэны могуць зваліцца глыбей звычайнага, толькі калі на рынку з'явіцца вялікая колькасць новабудоўляў па 700—800 долараў за «квадрат», аднак перадумоў для гэтага цяпер няма, бо, як ужо было адзначана, адсутнічае канкурэнцыя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Май на ўвазе

# РАЗБУРЫЦЬ СЦЯНУ СТЭРЭАТЫПАЎ

## Каму выгадна супрацоўнічаць з агенцтвамі нерухомасці ў Беларусі?

**За апошнія гады колькасць агенцтваў нерухомасці па Мінску і іншых гарадах значна ўзрасла. Некаторыя ўласнікі ўсё яшчэ баяцца супрацоўнічаць з імі і трапіць на «чорных рыэлтараў», а кліенты не разумеюць, навошта агенцтвам плаціць. Разам са спецыялістам аднаго сталічнага агенцтва Лізаветай ГАЙДАРАВАЙ разбяромся, чаму рыэлтарскія паслугі карыстаюцца попытам і як будуецца работа знутры агенцтваў.**

**Юрыдычная кансультацыя.** Першае, што заўсёды хвалюе людзей у пытаннях нерухомасці, гэта юрыдычныя пытанні. Іх заўсёды шмат ва ўсіх удзельнікаў працэсу. Звычайна гэта датычыцца налогаў, тэрмінаў аплат, парадку заключэння дагавора. Звяртаючыся да спецыялістаў, якія працуюць па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, вы атрымаеце самую дакладную і актуальную інфармацыю. Апіраючыся на вопыт, спецыяліст распрацоўвае схему работы з дакументамі, а таксама дакладна ведае, калі пайсці, куды, у якой паслядоўнасці і што неабходна мець на руках. Менавіта такая схема дапаможа аформіць дакументы ў аптымальны тэрмін і з мінімальнымі матэрыяльнымі выдаткамі як для гаспадароў, так і для кліентаў.

**Вашы ўмовы.** Многія, хто шукае кватэру для арэнды самастойна, сутыкаюцца з нежаданнем гаспадароў узяць іх з сабакамі або катамі. Калі схлусіць у такім выпадку, то пасля могуць узнікнуць праблемы для ўсіх. Агент ведае, як правільна данесці гэтыя звесткі да ўладальніка і ўлічыць усе вашы патрэбы пры пошуках. Перадаўшы рыэлтару або агенту інфармацыю аб тым, якая вам кватэра патрэбна, яе месцазнаходжанне, наяўнасць рамонту, ён падбярэ толькі прыемныя варыянты. Менавіта ён возьме на сябе адказнасць за папярэднія перагаворы і выключыць колькасць непатрэбных кантактаў. Такім чынам, сэканоміць час усіх зацікаўленых у здзелцы.



**Аператыўнасць.** Агенцтвы нерухомасці працуюць па сваіх базах аб'ектаў, якія рэгулярна абнаўляюцца, і могуць прапанаваць такі варыянт, які вы дакладна самі не знойшлі б. Таксама можна скарыстацца такой рыэлтарскай паслугай, як падбор варыянта здзелкі з аб'ектам. У гэтым выпадку арганізацыя прымае на сябе адказнасць менавіта падабраць для спажыўца аб'ект, які адпавядае яго пажаданням. Такая паслуга звычайна называецца «па факце». Увогуле, існуюць агенцтвы, якія працуюць толькі па факце і не патрабуюць ніякіх папярэдніх аплат за паказы. Калі вырашылі шукаць кватэру праз спецыялістаў і не хочацца трапіць на ашуканцаў, звярніце ўвагу менавіта на такі метад.

**Дзяржаўныя тарыфы.** Плата спажыўцамі рыэлтарскіх паслуг ажыццяўляецца па тарыфах (стаўках) на рыэлтарскія паслугі, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 сакавіка 2008 года № 386. Кошт кожнай асобнай паслугі звязаны з памерам дзеючай базавай велічыні. Калі змяняецца базавая велічыня, адпаведна, змяняецца і сума аплаты. У пастанаўленні прапісаны ўсе віды паслуг для спажыўцоў, якія можа аказаць агенцтва: арэнда (найм) аб'ектаў жылога фонду, падбор аб'екта нерухомасці, арганізацыя і правядзенне здзелак, аказанне дапамогі ў падрыхтоўцы дакументаў і г. д.

Плануючы маніпуляцыі з нерухомасцю, іншы раз задумайцеся аб сваёй кампетэнцыі ў гэтай сферы. Ці зможаце вы самастойна правесці такую здзелку або лепш даверыцца прафесіяналам сваёй справы, якія з такой работай сутыкаюцца кожны дзень і маюць каласальны вопыт?

**Марыя ТАРНАЛІЦКАЯ.**

Добраўпарадкаванне

# Мадэрнізацыя спартыўных пляцовак

**Гэта навіна для аматараў заняткаў фізічнай культурай на свежым паветры. Мясцовыя ўлады сталіцы разгледзелі пытанне аб стане і функцыянаванні дваровых спартыўных пляцовак.**

Цяпер большасць іх, як паведамілі ў Мінгарвыканкаме, чакае паступовая і грунтоўная мадэрнізацыя. Усяго ў горадзе 285 такіх збудаванняў. Многія ўжо фізічна і маральна састарэлі. Таму мадэрнізацыя закране значную частку дваровых спартыўных пляцовак.

Прычым зроблена гэта будзе па тыпавым праекце. Распрацавана адпаведная форма шматпрофільнай спартыўнай пляцоўкі, якая і ляжа ў аснову рамонту старых пляцовак. Падчас яго мяркуецца ўладкаваць штучнае пакрыццё, футбольную браму, баскетбольныя кольцы, іншыя спартыўныя прыстасаванні і снарады.

Адміністрацыі раёнаў і галоўнае ўпраўленне спорту і турызму Мінскага гарвыканкама ўжо ўключыліся ў гэтую работу, у прыватнасці распрацаваны графікі мадэрнізацыі дваровых спартыўных пляцовак.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**

# СВЯТЫ АБАВЯЗАК — ЗАХАВАЦЬ ПРАЎДУ

**Учора з самага ранку на станцыі Мінск-Пасажырскі было надзвычай шматлюдна. І гэта не звязана з пачаткам лета і дачным сезонам. На вакзале сустракалі незвычайны састаў... На перон прыбыў «Цягнік Перамогі».**


Фота БелТА.

Гэта інтэрактыўная экспазіцыя, якая пераносіць наведвальнікаў у падзеі Вялікай Айчыннай вайны. У дзевяці вагонах (а ўсяго іх 12) расказваецца аб подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці, аб жыцці ў акупацыі, транслюецца геройчная барацьба на франтах, у падполлі і партызанскіх зонах, доўгачаканая Перамога!

— Наш святы абавязак — захаваць гістарычную праўду, памяць аб Перамозе над нацызмам і перадаць яе будучым пакаленням, — адзначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар ЛУЦКІ.** — Супраць Беларусі і Расіі ідуць інфармацыйныя войны і атакі, якія не спыняюцца. Нашым людзям, асабліва моладзі, спрабуюць навязаць наскрозь фальшывыя гістарычныя наратывы, калі Савецкі Саюз нароўні з фашысцкай Германіяй абвінавачваюць у развязванні Другой сусветнай вайны, калі савецкія сімвалы прыраўноўваюцца да нацысцкіх, а людзям забараняюць святое для іх свята пад сцягам Вялікай Перамогі. Яны хочуць, каб мы, нашчадкі герояў-пераможцаў, апраўдваліся за сваіх дзедаў і прадзедаў, якія цаной уласнага жыцця выратавалі жыццё ўсяму чалавецтву. Мы прынялі гэты выклік, мы адстаім праўду, адстаім наша права на памяць аб подзвігу, наша права на суверэнныя развіццё сёння і ў будучыні.

Над гісторыка-асветніцкім праектам «Цягнік Перамогі» працавала вялікая каманда прафесіяналаў. Менавіта дзякуючы іх намаганням, трапіўшы ў цягнік, быццам сам з'яўляешся калі не ўдзельнікам, то сведкай тых геройчных, а разам з тым трагічных падзей. У цягніку можна не толькі дакрануцца да прадметаў, але і пачуць аўдыяапавед. Медыяэкраны, трохмерныя панарамы, поўнамаштабныя фігуры герояў, незвычайныя лакацыі, спецэфекты, датчыкі прысутнасці, панарамы баёў віртуальнай рэальнасці — сучасныя тэхналогіі дазваляюць пазнаёміцца з многімі эпізодамі Вялікай Айчыннай вайны.

Састаў прыйдзе па многіх рэгіёнах нашай краіны. 80-ю гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны сустрэне ў Брэсцкай крэпасці-героі, якая адной з першых прыняла ўдар гітлераўцаў. Завяршыцца маршрут 27—28 чэрвеня ў Магілёве — у дзень вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Кожны трэці

# СІМВАЛ ПАМЯЦІ

**Дальва стала апошняй са 186 беларускіх вёсак, якія паўтарылі лёс Хатыні**

**Трагедыя адбылася 19 чэрвеня 1944 года. Акупанты, заціснутыя з усіх бакоў савецкімі войскамі і партызанскімі злучэннямі, адступалі. Ужо амаль пераможаныя, беглі і... працягвалі рабіць сваю чорную справу. Усіх дальвінцаў сагналі ў адну з хат і падпалілі. У полымі загінулі 44 чалавекі: двое мужчын, 13 жанчын, 29 дзяцей. Да вызвалення Беларусі заставаліся лічаныя дні...**

## ЧОРНЫ ПАНЯДЗЕЛАК

Адзінаму, каму пашчасціла не апынуцца ў тым вогнішчы, быў 13-гадовы Коля Гірыловіч. За некалькі гадзін да трагедыі маці адправіла яго падмяніць бацьку, які кіламетры за два ад вёскі пасвіў каня. Тады хлопчык яшчэ не ведаў, што гэты факт выратуе яму жыццё...

***— ЗАВЯРШАЕЦЦА пракат па краіне фільма «Лёс дыверсанта», на мінулым тыдні стартавалі паказы навінкі, першага беларускага анімацыйнага мюзікла «Зоркі сёмага неба». Уладзімір Міхайлавіч, віншую вас і калег з прэм'ерамі. Калі ўжо згадала патрыятычную стужку «Лёс дыверсанта», давайце пачнём размову з тэмы ваеннага кіно. Здаўна і па сёння Нацыянальную кінастудыю «Беларусьфільм» называюць «Партызанфільм» з-за таго, што шмат кінастужак прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Наколькі сёння праўдзівае такое азначэнне кінастудыі, ці ўдзяляецца ўвага ваеннай гісторыі цяпер?***

— Гэтай тэматыцы ўдзялялася і будзе ўдзяляцца ўвага. Сёння трэба гаварыць пра вайну і гаварыць сумленна, бо некаторыя імкнуцца перапісваць гісторыю. Мы забываем пра тое, што Беларусь — адна з самых пацярпелых ад Другой сусветнай вайны краін. Няма ніводнай сям'і, дзе б ні было сваякоў, якія ваявалі ці загінулі. А мы занадта легкадумна ставімся да гэтай тэмы, лічым, што можна проста забыць. Перамогу спрабуюць адабраць у нас, кажучы, што не было Хатыні, канцлагераў. Як гэта не было?! Сябры, трэба больш беражліва ставіцца да гісторыі. І я лічу, што наша кінастудыя павінна працягваць сваю знакавую традыцыю.

Кінастудыя носіць статус нацыянальнай. Чамусьці зараз мы саромеемся слова «ідэалогія». У амерыканскім кіно не сустрэнеш ніводнай стужкі, дзе б ні мільгануў іх сцяг — гэта не ідэалогія? У кіно яна павінна прысутнічаць. Нам неабходна вучыцца любіць сябе, паважаць, памятаць, хто мы ёсць. Нацыянальная кінастудыя павінна таксама займацца выхаваннем. Таму мы здымаем кіно, якое расказвае пра подзвігі, пра герадчнае мінулае і аб'яднанне людзей. На мой погляд, трэба хоць бы раз на год выпускаць па фільме такой тэматыкі.

***— Як, на ваш погляд, зрабіць кіно пра Вялікую Айчынную вайну цікавым для маладых людзей? Як прыцягнуць аўдыторыю паглядзець той жа «Лёс дыверсанта»?***



— Мы ўсё зараз шукаем правільнае рашэнне, «кручок», на які падчапіць гледача. Былі нядрэнныя прыклады ў расіян у выглядзе фільмаў «Мы з будучыні». Па сюжэце нашых сучаснікаў перакідвалі ў час Вялікай Айчыннай вайны, гледачы сачылі за развіццём іх характараў, ацэньвалі паводзіны герояў у пачатку фільма і ў канцы. Гэта належны ход. У кіно трэба гаварыць мовай, зразумелай сучаснай публіцы, і не рабіць пластмасавых герояў — подзвігі здзяйснялі простыя людзі. Я лічу, што толькі дарагой графікай, экшнам зараз гледача не зачэпіш. Трэба зацікавіць іншым — акцёрскім майстэрствам, псіхалогіяй, драматургіяй сюжэта. Напакаваныя спецэфектамі фільмы пра супергерояў і баевікі ўжо не цікавяць, як раней. Накот «Лёсу дыверсанта»... Не ведаю, ці будзе ён зразумелы ўсёй моладзі, але мы паспрабавалі паказаць жывога героя.

***— З ваеннай тэматыкай зразумела. А якія тэмы яшчэ ў трэндзе ў нацыянальнай кінастудыі?***

— У мяне ёсць вялікае жаданне здымаць кіно для моладзі. Трэба вярнуцца да іх інтарэсаў — не загаворваць камерцыйным кіно, серыяламі, а здымаць фільмы на тэмы, якія іх хвалююць. Часам гэта будзе не зусім прыемнае кіно, але праблемы неабходна ўзнімаць. Напрыклад, як існаваць у сучаснай інфармацыйнай прасторы, як будаваць адносіны ў сям'і. Актуальная тэматыка барацьбы з наркотыкамі, негатыўным уплывам сацыяльных сетак, у трэндзе пытанне ўспрымання гісторыі сваёй краіны, паняцця свабоды. Акрамя таго, неабходна зразумець, чым мы можам быць цікавыя не толькі ўнутры краіны, але і за межамі. Хочацца зняць кіно, якое прыцягне і рускіх, і амерыканцаў, і кітайцаў, і індусаў, а таксама будзе запатрабавана ў інтэрнэт-прасторы. Кіно — гэта інструмент, які павінен садзейнічаць аб'яднанню краіны і яе развіццю.

***— «Беларусьфільм» можа даць шмат магчымасцяў для кіназдымак: ад стварэння касцюмаў да постпрадакшну карціны. Наколькі паспяхова кінастудыі ўдаецца зарабляць на гэтых паслугах грошы?***

— Кінастудыя — дарагая рэч для такой невялікай краіны, як наша. У нас ёсць поўны цыкл вытворчасці, свая натурпляцоўка, і мы ўвесь час зараблялі грошы. Калі ўдарыла пандэмія, колькасць знешніх заказаў паменшылася. Лакдаўн аказаў значны ўплыў на нашу знешнеэканамічную дзейнасць.

У 2019 годзе мы казалі аб прагрэсе: да нас прыехалі кітайцы, індусы, казахі, узбекі. Мы гаварылі нават пра стварэнне праграмы, якая садзейнічала б прыходу заказчыкаў. Цяпер жа марым пра вяртанне да гэтай тэмы і прыстасоўваемся да цяперашняй сітуацыі. Але мы спрабуем развівацца, зарабляць. Дзякуй за падтрымку дзяржавы, якая нас выратоўвае.

Кінастудыя будзе зарабляць. Мы стварылі матэрыяльна-тэхнічную базу, працуем над уласнымі фільмамі — анімацыйнымі, дакументальнымі, вярнуліся да мастацкіх. Завяршыліся здымкі чатырохсерыйнага фільма, у найбліжэйшы час плануюцца здымкі васьмісерыйнага, запусцілі ў пракат некалькі карцін, спрабуем працаваць з замежнымі агентамі па продажы нашай кінабібліятэкі, займаемся рэстаўрацыяй. Мы прапаноўваем свае паслугі арганізацыям, што займаюцца не толькі кінавытворчасцю, але і рэкламай, турызмам, івэнтам. Ёсць ажыўленне і вялікія заказы на найбліжэйшы час.

***— Часта можна ўбачыць у расійскіх фільмах мясціны Мінска. Чаму ў нашай сталіцы так імкнуцца здымаць карціны?***

— Расіянам танней прывезці сваю здымачную групу і за кароткія тэрміны зняць фільм тут. У нас развітая інфраструктура, добрыя дарогі, прасцейшая лагістыка перамяшчэння, нармальныя цэны, свае спецыялісты. Для таго каб зняць фільм у Маскве, давядзецца прыкласці больш сіл. Прадзюсары лічаць грошы — у нас танней. Мы даём усе магчымасці для здымак: транспарт, масоўку, абсталяванне. Напрыклад, калі здымкі ў Маскве зоймуць месяц, тут група справіцца за тыдзень. У нас ёсць прыдатныя прасторы, натурпляцоўка, дзе магчыма здымаць прыродныя пейзажы.

***— Чым канкрэтна кінастудыя дапамагае ў арганізацыі такіх здымак?***

— Мы дапамагаем у комплекснай працы, калі трэба даць вялікія аб'ёмы касцюмаў, задзейнічаць маштабныя павільёны. Плюс у нас ёсць натурпляцоўка пад Мінскам, якая ўключае два возеры, лес, поле, партызанскі лагер. Там ёсць і месца для пражывання здымачнай групы.

***— З расіянамі зразумела. А чым «Беларусьфільм» цікавы індусам, якія прыязджаюць да нас здымаць?***

— Мы для іх экзотыка. Пры гэтым у нас шмат магчымасцяў для здымак. Яны вельмі хочуць працаваць з намі. У нас, паўтаруся, прывабная, развітая інфраструктура, спецыялісты, нармальныя цэны. І дзяржаўная кінастудыя дае гарантыі стабільнасці выканання абавязкаў. Па запыце мы можам аказаць шырокі комплекс паслуг: пачынаючы ад арганізацыі сустрэчы, наладжвання кантактаў з дзяржаўнымі органамі, дамоваў з пагранічнымі і мытнымі органамі. Мы можам арганізаваць здымачную групу, падабраць артыстаў, пашыць касцюмы, стварыць рэквізіт, дэкарацыі, заказаць транспарт, наняць каскадзёраў, забяспечыць выкарыстанне зброі, піратэхнікі. Напрыклад, для індыйскай кампаніі мы запрашалі супрацоўнікаў міністэрстваў абароны і ўнутраных спраў для масоўкі. І канешне, мы можам займаца постпрадакшнам — мантажом, гуказапісам, звядзеннем канчатковай стужкі.

***— У Беларусі ёсць свае каскадзёры?!***

— Ёсць і каскадзёры, і добрыя піратэхнікі. Замежныя піратэхнікі здзіўляліся: нашы спецыялісты рабілі за два-тры дублі тое, што можна здымаць увесь дзень. Неабходна толькі паставіць задачу і сказаць, што ёсць бюджэт, — яны арганізуюць усё.

***— Калі закранулі пытанне спецыялістаў, як справы з кадрамі для кіно?***

— Кадраў не хапае. Не хапае не толькі спецыялістаў, але і людзей, якія мысляць крэатыўна. Асабліва што датычыцца яркіх рэжысёраў, аператараў, мастакоў, сцэнарыстаў, грымёраў. Неабходна гадаваць выканаўчых прадзюсараў, якія могуць арганізаваць здымачны працэс. З кадрамі ёсць праблема, і гэта скажа не толькі «Беларусьфільм», але і прыватныя кампаніі. Хтосьці хоча вялікія грошы, хтосьці з'ехаў за мяжу, а хтосьці яшчэ не змог навучыцца ці не хоча мяняцца. Трэба абнаўляць кінасупольнасць і фарміраваць больш прафесійнае асяроддзе, якое не жыве мінулымі правіламі. Кіназдымачная група павінна адказваць не толькі за працэс, але і за канчатковы вынік. А ў нас некаторыя спецыялісты працуюць толькі на працэс, таму і ёсць пытанні да прадукцыі. Калі пачынаюцца размовы: «Дзе айчыннае кіно?», кажу, што дзяржава стварыла ўмовы, а пытанне да вас — рэжысёраў, сцэнарыстаў, аператараў: чаму вы не знялі якасна? Кіно робяць не дырэктары і не міністры. Я не здымаю адказнасці з адміністрацыі кінастудыі, мы спрабуем перабудоўвацца ўсе і хочам па-іншаму падысці да арганізацыі здымачнага працэсу.

***— На кінастудыі зараз ідзе працэс рэстаўрацыі старых кінафільмаў. Раскажыце пра гэту дзейнасць.***

— Гэту работу неабходна было пачаць гадоў дзесяць таму. У нас, у адной з нямногіх кінастудый постсавецкай прасторы кінабібліятэка засталася за намі. Мы апошнія гады вярталі маёмасныя правы кінастудыі на большую колькасць фільмаў. Кінабібліятэка змяшчае фонд у 650 мастацкіх фільмаў розных жанраў, 2000 дакументальных стужак і 250 анімацыйных. Частка з іх не адпавядае цяперашнім тэхнічным крытэрыям. Патрабуюцца алічбаванне, абнаўленне гуку і колеракарэкцыя. Потым гэтыя стужкі магчыма перадаць у іншыя краіны для прагляду. Але і беларускія тэлеканалы сёння перайшлі на HD, і глядач хоча бачыць больш якасную карцінку.

анімацыі здымаюць не толькі забаўляльнае кіно, але і фестывальнае — сапраўдныя творы мастацтва. Час уносіць карэктывы, і неабходна выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі 2D, 3D. Мы закупілі некалькі працоўных станцый і плануем адправіць на павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў па анімацыі.

Закончылі поўнаметражны мультфільм «Зоркі сёмага неба». Гэта беларускі анімацыйны мюзікл. У ім шмат песень на музыку Леаніда Шырына. Тэма фільма досыць актуальная — стаўленне да інтэрнэту, патуранне слабасцям, уздзеянне на маладых людзей. Мульцік атрымаўся цікавы. І ўжо ёсць прапановы купіць фільм ад іншых краін. Прадставілі яго ў нашых кінатэатрах. Таксама мы пачалі работу па стварэнні поўнаметражнага анімацыйнага фільма ў тэхніцы 3D «Песня Сірын», які прысвечаны нашай гісторыі, міфалогіі. Гэты прыгодніцкі фільм будзе стварацца тры гады.

**«Хочацца зняць кіно, якое прыцягне і рускіх, і амерыканцаў, і кітайцаў, і індусаў, а таксама будзе запатрабавана ў інтэрнэт-прасторы».**

Беларускія мульцікі — не толькі для дзіцячай аўдыторыі. Мы зрабілі падзейны паказ мультфільма «263 ночы» з элементамі дакументалістыкі. Гэта фільм пра Мінскае гета. Закадравы тэкст чытае Арыстарх Ліванаў, гукааператар Віктар Морс — легенды савецкага кіно.

***— Якія праблемныя пытанні выходзяць на першы план у айчынных спецыялістаў кіно сёння?***

— Мы недастаткова займаемся самапіярам, не хапае грошай. Мы, беларусы, не вельмі любім сябе і лічым, што дзесьці лепей. Я задаю пытанне: «А ты глядзеў, перш чым крытыкаваць? Ты спачатку паглядзі, а потым рабі высновы».

Сёння мы перабудоўваем стратэгію адносін з кінематаграфістамі, больш дакладна вызначаем для сябе задачы. То-бок я зацікаўлены працаваць не на працэс, а на канкрэтны вынік. Таму і адбываюцца рэформы. Хтосьці лічыць мяне разбуральнікам традыцый, але прыйшоў час паглядзець на кінаіндустрыю па-іншаму. Мы ўжо не можам існаваць як раней.



Кадр з мультфільма «Зоркі сёмага неба».

Нашы фільмы гатовы набыць, але неабходна больш высокая якасць. Спачатку пачалі рэстаўрацыю самастойна, а сёлета дзяржава нас падтрымала грашыма: дапамагла набыць абсталяванне. У гэтым годзе мы павінны 1320 хвілін фільмаў адрэстаўрыраваць за мэтавыя грошы і пусціць у продаж абноўленыя версіі. Зараз ідзе рэстаўрацыя фільмаў «Канстанцін Заслонаў», «Горад майстроў», «Юрка, сын камандзіра». Да Дня Незалежнасці хочам паказаць адрэстаўрыраванага «Канстанціна Заслонава». Маюць патрэбу ў рэстаўрацыі фільмы Віктара Турава і фільмы па творах Івана Шамякіна, Івана Мележа.

***— Сёлета анімацыйная студыя «Беларусьфільма» адзначыла паўвекавы юбілей. З нагоды выйшаў і першы поўнаметражны айчынны мультфільм. Раскажыце пра гэты кірунак кінастудыі.***

— У нас выдатная школа анімацыйнага кіно са старымі традыцыямі. У жанры

***— Вы можаце сказаць, што за тры гады, якія вы ўзначальваеце кінастудыю, там адбыліся значныя перамены?***

— У нас адбываюцца ўнутрыстудыйныя рэформы. Пачалі больш актыўна працаваць на замежным рынку, вярнулі маёмасныя правы на кінабібліятэку, узмацнілі матэрыяльна-тэхнічную базу. У нас з'явіліся партнёры па ўсім свеце. Выхад на знешнія рынкі я лічу асаблівым дасягненнем. Мы сапраўды можам аказваць усе віды кінапаслуг, рэструктурыруем работу: перасталі працаваць на ўтрыманне кінастудыі, а працуем на эфектыўнасць. Мы вызначаем больш дакладна для сябе задачы: будзем пісаць сцэнарый пад канкрэтную тэму, а не чакаць сцэнарыі; змяняем мадэль існавання кінастудыі. Мы ўдзячны дзяржаве за падтрымку і спадзяёмся, што ў кінастудыі будзе цікавая будучыня.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**Фота www.belarusfilm.by**

Запрашальнік

# «Мы вывучаем асяроддзе»: прэзентацыя фестывалю «Манумент»

**Чаму манументалізм нам неабходны? Як можна візуалізаваць гісторыю краіны? І чаму нам трэба браць прыклад з італьянцаў? Зусім хутка ў Мінску адкрыецца фестываль «Манумент». Падчас прэс-канферэнцыі арганізатары падзяліліся планамі, а таксама падрабязна расказалі аб манументалізме.**





**Прaграма фестывалю**

***17 чэрвеня, Палац мастацтваў.*** Адкрыццё агульнага праекта-форума «Манумент».

***21 чэрвеня, галерэя «Мастацтва».*** Выстава графікі мастакоў-манументалістаў.

***22 чэрвеня, галерэя «БелАрт».*** Асобны выставачны праект мастака-манументаліста Алеся Сушы.

***23 чэрвеня, мастацкая галерэя твораў Л. Д. Шчамялёва.*** Праекты мастакоў Каміля Камала і Сямёна Дамарада.

***24 чэрвеня, выставачная зала імя А. Бембеля.*** Персанальная выстава мастака-манументаліста Віктара Нямцова.

***30 чэрвеня, арт-гасцёўня «Высокае месца».*** Выстава работ маладых мастакоў-манументалістаў.

Выстава работ студэнтаў кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва БДАМ. Арганізатары ўдакладняць дату правядзення пазней.

**Глеб ОТЧЫК, старшыня Беларускага саюза мастакоў,** кажа:

— Мастакі-манументалісты адрозніваюцца ад проста жывапісцаў тым, што ствараюць роспісы, вітражы і фрэскі. Гэта не камерцыйны від мастацтва, таму можна казаць аб тым, што манументалісты працуюць для душы. Менавіта ў гэтым і палягае ўнікальная рыса фестывалю: наведвальнікі ўбачаць патаемнае, вельмі асабістае мастацтва.

Нельга забыць аб беларускіх заснавальніках кірунку. Асновы былі закладзены Аляксандрам Кішчанкам, Маем Данцыгам, Гаўрыілам Вашчанкам і Уладзімірам Стальмашонкам. **Мастацтвазнаўца Наталля ШАРАНГОВІЧ** дадае:

— Узлёт айчыннага манументальнага мастацтва прыйшоўся на 1970—1980-я гады. У 1961-м была створана кафедра ў тэатральна-мастацкім інстытуце, а ў 1969-м — секцыя манументальна-дэкаратыўнага мастацтва пры Саюзе мастакоў. То-бок у сямідзясятыя гэты пласт мастацтва ўжо сфарміраваўся і меў вялікую папулярнасць. На сёння гэта можа здавацца не такім ужо відавочным, але ўявіць нашу гарадскую прастору без манументальнага мастацтва немагчыма.

На пытанне «Чаму мы не можам абысціся без манументалізму?» адказаў **куратар фестывалю Васіль ЗЯНЬКО:**

— Манументалізм існуе ў нашай паўсядзённасці. Яго можна сустрэць і ў метро, і ў будынках дзяржаўных устаноў, і ў музеях. Мастакі фарміруюць знешні і ўнутраны вобраз гарадской архітэктуры, аблічча нашай культуры і краіны.

— Пяць гадоў я быў у журы конкурсу, які праводзіцца ў Фларэнцыі, — дадае Глеб Отчык. — Звярну вашу ўвагу на тое, што шэсцьдзясят працэнтаў сусветнай манументальнай культурнай спадчыны засяроджана ў Італіі. І вось калі ты сустракаеш дзяцей, якія выхоўваюцца сярод фрэсак, вітражоў і іншых эстэтычна каштоўных рэчаў, то разумееш, што яны вырастуць людзьмі з правільным светаўспрыманнем. А калі мы існуем у шэрых панэльках і ў нас нічога няма — аб чым тады можа ісці гаворка? Мы павінны выходзіць з ліфта і бачыць пано, якое распавядае аб прыродзе Беларусі, аб нашых нацыянальных асветніках. Толькі тады ў нас узнікне зусім іншы візуальны густ. Падчас фестывалю мы паспрабуем падрабязней асвятліць гэтую праблему.

Фестываль «Манумент» будзе складацца з шэрагу міні-праектаў. Наведвальнікі ўбачаць жывапіс, скульптуры і інсталяцыі мастакоў-манументалістаў.

Падчас форуму запланаваны сустрэчы з мастакамі і аўтарскія экскурсіі. Таксама будзе арганізаваны круглы стол, тэма якога прысвечана захаванню культурнай спадчыны манументальнага мастацтва.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# Вечарыны ў Гальшанскім замку

**Класічныя музычныя вечары каля сцен Мірскага замка, здаецца, знайшлі працяг у аналагічным культурным мерапрыемстве на Ашмяншчыне, якое, магчыма, стане пастаянным. Каля сцен замка Сапегаў у Гальшанах таксама зладзілі творчую вечарыну.**



Пасля нядаўняга адкрыцця для наведвальнікаў Паўночнай вежы замка гістарычны будынак стаў цэнтральным месцам падзей шматлікіх мерапрыемстваў краю. На выхадных падчас тэатралізаванай пастаноўкі госці сустрэліся з Паўлам Сапегам, Соф'яй Гальшанскай, Белай дамай і Чорным манахам. Такая падача легендаў і паданняў краю вельмі падабаецца і запамінаецца гледачам. Зладзілі таксама майстар-клас па сярэдневечных танцах і квэст-гульню для прыхільнікаў містыкі.

Мясцовыя майстры паказвалі, як нараджаюцца ганчарныя вырабы, цацкі хэндмэйд і лялькі-абярэгі. Падмацоўваліся госці слівавай гарбатай ды духмянай юшкай. А надвячоркам усіх чакалі канцэрт інструментальнай музыкі і арыгінальныя кампазіцыі, якія Ігар Задарожны, саліст Белдзяржфілармоніі, выканаў на крыштальнай арфе, сабранай з вінных келіхаў, і піле.

19 чэрвеня Соф'я Гальшанская ізноў чакае гасцей на свята у сваёй рэзідэнцыі і абяцае светлавое шоу. А дапамагаць ёй будуць музычны калектыў «Арацэя» і гістарычны клуб «Шатландская пяхота». Астатнія сюрпрызы арганізатары пакуль не раскрываюць.

**Ірына СІДАРОК.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 25 июня 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, отдельные характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | Административно-бытовой корпус АБЗ «Гореничи» общей площадью 204 кв. м, инв. № 611/С-916; складское помещение для хранения дров общей площадью 39 кв. м, инв. № 611/С-34214; техническое помещение для обслуживания водонапорной башни общей площадью 10,2 кв. м, инв. № 611/С-34215; стол «Амадей» т102 (1 шт.); силовой тренажер HouseFit DH – 8157 (1 шт.); бильярд «Магнат – Плюс» 8 фут. (1 шт.); машина стиральная Gorenje WS43101 (1 шт.); водонагреватель Ariston SG HP 200V (1 шт.); киевница напольная ПАЖ-2 (материал ясень) (1 шт.); светильник «Венеция» (1 шт.); стул «Амадей» s102 (6 шт.); стул ИСО Black (15 шт.); тумба для ТВ «Ниагара» (2 шт.); чехол защитный для бильярдного стола 8ф (1 шт.); шары «Арамит Премьер» (1 шт.); шкаф с витриной «Дэнвер-Э-9М» (1 шт.); электросушилка для рук Puff-8820 (3 шт.); антенна Variant 60 (2 шт.); бра «Орхидея» 13200/2 (4 шт.); зеркало (1 шт.); жалюзи вертикальные «Лайн» 1,5*2,2 кв. м (1 шт.); жалюзи вертикальные «Лайн» 1,7*1,7 кв. м (4 шт.); кий «Гигант-М», 2РС 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); кий «Онтарио» 1РС целый, 149 см (материал: канадский клен) (4 шт.); кий «Ярость», 2РС 2-составной, 156 см (материал: канадский клен) (1 шт.); мягкий уголок «Лагуна комфорт» (1 шт.); емкость подземная, горизонтальная, металлическая 50 м³ (1 шт.); телевизор «Горизонт» 21KF19V (1 шт.); цифровой спутниковый ресивер Eurosat DVB-3023 (1 шт.) |
| **Местонахождение** | Минская обл., Березинский р-н, Капланецкий с/с, 2, 2/1, 2/2 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь: 2,3610 га, кадастровый номер: 620482302101000151 |
| **Продавец имущества** | ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253 |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 20 411,93 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 2 000,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **25 июня 2021 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.06.2021 по 23.06.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ПОД УСТАНОВКУ И ОБСЛУЖИВАНИЕ ТОРГОВОГО КИОСКА

### ОРГАНИЗАТОР: НОВОЛУКОМЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| | |
|---|---|
| Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | **Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, по улице Панчука, в районе жилого дома № 18** |
| Целевое назначение | Под установку и обслуживания торгового киоска (земельный участок для размещения объектов розничной торговли, код 1 16 03) |
| Кадастровый номер земельного участка | 225151000002000143 |
| Площадь, га | 0,0020 |
| Срок аренды | 5 лет |
| Начальная цена объекта аукциона, руб. | 13,77 |
| Сумма задатка, руб. | 1,38 |
| Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | 365,76 |
| Условия инженерного развития инфраструктуры | Электроснабжение |
| Условия аукциона | **Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:**<br>- в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона, либо признания аукциона несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения;<br>- заключить с Новолукомльским горисполкомом договор аренды земельного участка не позднее двух рабочих дней после внесения денежных средств и выполнения условий, указанных в протоколе о результатах аукциона;<br>- в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды земельного участка и прав на него;<br>- получить в установленном порядке АПЗ и тех. условия для инженерно-технического обеспечение объекта строительства, разрешение на проведение проектно-изыскательских работ;<br>- разработать и утвердить в установленном порядке проектно-сметную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий 1 года года;<br>- приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее шести месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462 и состоится при наличии не менее двух участников.

**Перечень документов, представляемых участником аукциона**: заявление на участие в аукционе, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; **представителем иностранного юридического лица** – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; **консолидированными участниками** представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

Лицо желающее принять участие в аукционе обязано подписать с организатором аукционных торгов Соглашение , определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

*Задаток в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется на р/с BY11BAPB36413290700120000000, Новолукомльский горисполком, БИК BAPBBY2X, УНП 300008437.*

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи, а также с условиями, предъявляемыми к проектному решению сооружения, которое будет размещаться на предоставляемом земельном участке.

Победителю аукциона или единственному участнику несостоявшегося аукциона может быть предоставлена рассрочка внесения платы согласно действующему законодательству.

**Аукцион состоится 14 июля 2021 года в 15.00 по адресу: г. Новолукомль, ул. Энергетиков, 15, Новолукомльский горисполком, каб. 420.**

**Заявления на участие в торгах принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу:** г. Новолукомль, ул. Энергетиков, 15, Новолукомльский горисполком, каб. 420.

Последний день приема заявлений – **8 июля 2021 года до 17.00.**

Контактные телефоны: 8 (02133) 6 96 17, 6 77 15.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | |
| **Продавец** | **ОАО «Агролизинг», 220005, г. Минск, ул. Красная, 13-31, +37517-242-13-81** | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Лот № | Наименование (Назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
| 1 | **Административное помещение** (административное помещение) по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 4-1Н | 884 кв. м | 500/D-70779533 |
| Обременение: частичная аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by | | | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 1 014 057,14 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)** | | | |
| 2 | **Торговое помещение** (Торговое помещение) по адресу: г. Борисов, ул. Строителей, д. 26, пом. 5 | 1672,1 кв. м | 610/D-47661 |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 880 952,38 долларов США (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона)** | | | |
| С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY | | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001. Нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** 30 рабочих дней после проведения аукциона и, при необходимости, получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию | | | |
| В случае признания победителем аукциона либо единственным участником, согласившимся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на пять процентов, хозяйствующего субъекта, до совершения сделки, может потребоваться согласие антимонопольного органа (Министерства антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь) на экономическую концентрацию | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена **в течение 30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи и, при необходимости, получения согласия антимонопольного органа на экономическую концентрацию | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 06.05.2021 | | | |
| **Аукцион состоится 01.07.2021 в 12.00** по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 30.06.2021 до 17.00 по** указанному адресу | | | |

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ» (Продавец)

**ЛОТ № 1: ЗДАНИЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОЙ БАЗЫ,** инв. № 630/С-81098, 507 кв. м. Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Лебедевская, 6А. Обременение: аренда.

**Начальная цена с НДС** – 171 600,00 руб. Задаток – 17 160,00 руб. **Штраф** – 5 000,00 руб. Земельный участок с кадастровым номером 623850100003003178, 0,1979 га. Право постоянного пользования.

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Аукцион состоится 15.07.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **13.07.2021 в 11.00.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 24 июня 2021 года на 12-м открытом аукционе проводит 10-й от 27 мая 2021 года и 11-й от 10 июня 2021 года повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 114 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном К6-131 в составе: Кузов-фургон К6-131 № 12195 1980 г. 4 кат. Автошасси ЗиЛ-131 ш. 420403 дв. 289857 1980 г. 4 кат. 1380 км | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 5 700,00 | 1 140,00 |
| 128 | Специальный автомобиль ЗиЛ-131 с кузовом-фургоном КБ6-131 в составе: Кузов-фургон КБ6-131 № 08264 1985 г. 2 кат. Автошасси ЗиЛ-131 ш. 646980 дв. 428411 1985 г. 3 кат. 1485 км | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 5 700,00 | 1 140,00 |
| 131 | Автошасси КамАЗ-5320 ш. 00330781 дв. 585260 1989 г. 4 кат. 29892 км | г. Береза, в/ч 23324 | 8 500,00 | 1 700,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **24 июня 2021 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 21 июня 2021 года.**

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **24 июня 2021 г. с 9.15 до 10.00.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факсу (017) 319 35 41.

Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» № 74 от 21.04.21, № 80 от 29.04.21

# ЛЕТА. ДЗЕЦІ. ГОРАД



**У сталіцы Падзвіння карэспандэнт «Звязды» высветліў, чым карысным займаюцца падчас канікул дзеці і падлеткі, якія не з'ехалі да сваякоў у вёску або ў аздараўленчы лагер.**

### «Краіне дзяцінства» — восьмы дзясятак

У юных віцяблян і жыхароў прыгарада круглы год ёсць магчымасць бясплатна наведваць Віцебскі абласны палац дзяцей і моладзі. Аўтар гэтых радкоў у дзяцінстве сам наведваў гэтую ўстанову. Там мяне навучылі, у прыватнасці, гуляць у шашкі, даглядаць кветкі, ствараць «разумныя цацкі». Тады гэтае месца было вядома пад назвай «Абласны Палац піянераў і школьнікаў». Летась гэтай дзяржаўнай установе дадатковай адукацыі споўнілася 70 гадоў. Сёння гэта шматпрофільная ўстанова з багатым выбарам прапаноў.

У Віцебскім абласным палацы дзяцей і моладзі арганізавана работа больш за 390 аб'яднанняў па інтарэсах, у якіх займаецца каля 4000 навучэнцаў. Сваімі ведамі, творчым майстэрствам, тэхнічнымі навыкамі дзеляцца каля 190 педагагічных работнікаў, з іх прыкладна 130 педагогаў дадатковай адукацыі.

Мясцовая ўлада ўклала ў капітальны рамонт з мадэрнізацыяй будынкаў вялікія сумы. У прыватнасці, у мінулым годзе з абласнога бюджэту на гэта патрацілі каля 3,2 мільёна рублёў. Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў у жніўні браў удзел у цырымоніі здачы пад ключ адрамантаваных карпусоў палаца на вуліцы Фрунзэ, узведзеных у канцы 1960-х гадоў. Яшчэ раней прывялі ў парадак будынак у цэнтры горада, які быў пабудаваны праз некалькі гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

### Ад віртуальнасці да драўняных гульняў

Тут ёсць тое, пра што яшчэ нядаўна пісалі фантасты. Напрыклад, шлемы віртуальнай рэальнасці: дзяцей вучаць ствараць віртуальны свет. У палацы і мультфільмы робяць — гэта магчыма на занятках у дзіцячай студыі мультыплікацыі. Тут ствараюць і праграмуюць робатаў, каб яны потым выступалі на спаборніцтвах. Напрыклад, рыхтуюць робатаў-сумаістаў, робатаў-гоншчыкаў з пераадольваннем перашкод, робатаў-біятланістаў.

Журналісту «Звязды» паказалі 3D-прынтар, які выкарыстоўваўся падчас першай хвалі пандэміі, каб друкаваць медыкам празрыстыя маскі з пластыку. Рука тэрмінатара, зробленая падлеткамі, — яшчэ адзін доказ, што будучыня тут ужо здзяйсняецца.

Не менш уражваюць і работы гурткоўцаў з дрэва. Іх вучаць ствараць бяспечныя для здароўя цацкі і гульні, якія набываюць усё большую папулярнасць. Тут ёсць нават музычны камін з падсветкай.

Вельмі развіта ў віцебскім палацы класічнае мадэляванне — аўто, самалётаў, караблёў, падводных лодак. Ёсць і басейн, каб праводзіць турніры па запуску суднаў.

У юных натуралістаў — шыкоўныя кабінеты для атрымання тэарэтычных ведаў, а для практыкі праводзяцца заняткі ў цяпліцах, у рамках праекта «Зялёная школа».

Гуляць у КВЗ, навучыцца аператарскай справе і майстэрству працаваць у кадры, стаць юным карэспандэнтам друкаваных СМІ або папулярным блогерам — гэтыя магчымасці дае палац. Яшчэ — займацца вакалам, харавымі спевамі, у тэатры мініяцюр,ва ўзорным дзіцячым тэатральным калектыве, у эстраднай і вакальна-эстраднай студыі, у харэаграфічных калектывах, у прыватнасці школе брэйк-данса.

У структуры палаца нават маецца аздараўленчы лагер «Дружныя рабяты» пад Віцебскам.

### Якія яны, піянеры XXI стагоддзя?

У Віцебскім абласным палацы дзяцей і моладзі — былым Палацы піянераў, і цяпер знаходзіцца галоўны піянерскі «офіс» рэгіёна. Сучасная піянерская арганізацыя, калі хто не ведае, гэта не нешта «нафталінавае», сцвярджае **Ірына ЯЛЕНСКАЯ, старшыня Віцебскага абласнога Савета грамадскага аб'яднання «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя».** Гэта магчымасць цікава бавіць час, навучыцца таму, што можа спатрэбіцца ў дарослым жыцці, праявіць свае лідарскія здольнасці, кажа яна.

Летам піянеры ходзяць у паходы, працягваюць цімураўскую працу, бяруць удзел у патрыятычных акцыях. У прыватнасці, нядаўна ўпершыню правялі «Зарніцу» на сапраўдным ваенным палігоне «Лосвіда» 103-й Віцебскай асобнай гвардзейскай Чырванасцяжнай, ордэна Леніна, ордэна Кутузава II ступені паветрана-дэсантнай брыгады імя 60-годдзя СССР. Традыцыйна хлопчыкі і дзяўчынкі бяруць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і святкаванні Дня Незалежнасці.

Штогод усё больш удзельнікаў у працоўнай акцыі па зборы другаснай сыравіны «Зробім свет чысцейшым!», ахвотных выйграць «Конкурс малых грантаў арганізацыйных структур БРПА». Самае масавае мерапрыемства ў Віцебскай вобласці і гонар абласной піянерскай арганізацыі — фестываль «Патрыёты.by». Таксама праводзіцца злёт валанцёрскіх і цімураўскіх атрадаў «Адкрытае сэрца».

### Лета з міліцыяй

У Віцебску не забываюць і пра дзяцей, якія прыцягнулі ўвагу міліцыі. **Старшы інспектар па асаблівых даручэннях групы арганізацыі работ інспекцыі па справах непаўналетніх аддзела прафілактыкі ўпраўлення правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі УУС Віцебскага аблвыканкама маёр міліцыі Раман БАРДЗЕЕЎ** паведаміў, што, як і ў мінулым годзе, у чэрвені запрацуе змена ў летніку «Чайка». Каля трыццаці хлопчыкаў і дзяўчынак бясплатна на працягу дваццаці дзён змогуць цікава правесці час. Адпаведную ініцыятыву падтрымалі ў аблвыканкаме. У праграме — спартыўныя і інтэлектуальныя мерапрыемствы, паказальныя выступленні супрацоўнікаў падраздзяленняў міліцыі, сустрэчы з прадстаўнікамі МНС.

Арганізавана работа і ваенна-патрыятычнага лагера на базе 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай брыгады. Дзеці і падлеткі на свае вочы ўбачаць, як служаць у арміі. Іх чакаюць агнявая і страявая, паветрана-дэсантная падрыхтоўкі, засваенне навыкаў выжывання ў асаблівых умовах.

Летам функцыянуюць клубы для падлеткаў і пры адным з РАУС Віцебска, а таксама Віцебскага раёна. Там міліцыянеры не толькі вядуць прафілактычныя размовы з падлеткамі, але і вучаць прыёмам самаабароны, кулявой стральбе, сілавым практыкаванням. Плануюць арганізаваць абласны футбольны турнір «Нас аб'ядноўвае спорт» — для дзяцей, з якімі праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа. Яны знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы і засталіся без апекі бацькоў. У другой палове чэрвеня адбудуцца веласіпедныя прагулкі падлеткаў з супрацоўнікамі міліцыі. Падчас падарожжа будуць прыпынкі каля вяровачнага комплексу, дзе юныя ўдзельнікі пераадолеюць нялёгкі шлях над зямлёй. Прапануецца магчымасць паўдзельнічаць у міліцэйскай эстафеце: прабегчы ў бронекамізэльцы, шлеме, паспаборнічаць на трапнасць стральбы з пнеўматычнай зброі. Потым — сяброўскае чаяпіцце. Будзе і экскурсія ў Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей, наведванне мемарыяльнага комплексу ў вёсцы Шапуры, падвядзенне вынікаў акцыі ў Віцебску з уручэннем прызоў.

Калі падапечныя міліцыі заняты карыснымі, добрымі справамі, у іх няма часу, жадання, ды і сіл парушаць закон, а значыць, і ў дарослым жыцці яны будуць імкнуцца пазбягаць правапарушэнняў, лічыць Раман Бардзееў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Карысныя парады

# ПАХУДЗЕЦЬ БЕЗ СТРАТЫ ЗДАРОЎЯ,

## або Як абнавіць свае смакавыя рэцэптары

**Людзі жадаюць быць прыгожымі незалежна ад пары года, але ў многіх летам з'яўляецца спакуса пахудзець хуценька і пажадана да свайго адпачынку. У інтэрнэце можна знайсці дзясяткі парад, як гэтага дамагчыся. Тут табе і грэчневая дыета, разгрузачныя дні на яблыках, грэйпфрутах, кефіры, а некаторыя ўвогуле адмаўляюцца ад ежы і спрабуюць метады інтэрвальнага, лячэбнага галадання. Але наколькі бяспечны такія экстрэмальныя метады? Аб тым, як скінуць вагу і абзавесціся карыснымі звычкамі ў харчаванні, расказала ўрач-дыетолаг Надзея ЛІТВІНАВА-ГРАЗІЁН.**



### ЦІ РЭАЛЬНА СКІНУЦЬ ВАГУ ЗА МЕСЯЦ?

На самай справе ўсё залежыць ад таго, колькі кілаграмаў хацелася б скінуць. Дыетолаг лічыць, што худзець няцяжка, складаней трымаць жаданую вагу.

«Многае залежыць ад фактараў, такіх як узрост, стан здароўя, вага, — тлумачыць дыетолаг. — Напрыклад, чым большая вага, тым хутчэй сыходзяць першыя кілаграмы. Адбываецца гэта за кошт страты вадкасці. Для таго каб страціць хоць бы дзесяць кілаграмаў, дастаткова двух месяцаў. Калі ж вага першапачаткова нязначна перавышае норму, то і кілаграмы сыходзяць павольней. А калі казаць пра бяспечнае пахудзенне, то зніжэнне вагі не павінна перавышаць 3-4 кілаграмы ў месяц».

Важна харчавацца збалансавана і разнастайна. Прадукты лепей ужываць максімальна простыя і старацца выконваць элементарныя правілы «здаровай талеркі»: палова талеркі — розныя салаты ці гародніна халоднай апрацоўкі, прыкладна чвэрць — асноўны прадукт, такі як рыба, птушка або мяса, а астатнюю чвэрць запаўняйце гарнірам, такім як рыс, бульба, грэчка, макарона.

«Важна наладзіць пітны рэжым і звярнуць увагу на ўмеранасць порцый, — раскрывае сакрэт здаровай дыеты Надзея Літвінава-Гразіён. — Старайцеся харчавацца як мага прасцей, нескладанымі стравамі альбо проста аднакампанентнымі. Напрыклад, той жа абед можа складацца з бялку — кавалачка мяса ці рыбы, вугляводаў у выглядзе круп альбо бульбы ці клятчаткі — гародніны».

Хтосьці лічыць, што трэба есці часта і дробнымі порцыямі, а некаторыя ядуць толькі два разы на дзень: раніцай і ўвечары. Спецыяліст лічыць, што ў гэтым пытанні трэба падыходзіць індывідуальна, бо шмат залежыць ад рэжыму дня, фізічнай актыўнасці і стану здароўя ў цэлым. Калі казаць аб кратнасці, то цалкам дастаткова трох поўных прыёмаў ежы: сняданка, абеду і вячэры. Калі адчуваеце неабходнасць, то можна зрабіць 1-2 лёгкія перакусы.

Здаровым перакусам лічацца прадукты з высокім утрыманнем бялку і складаных вугляводаў. Каларыйнасць іх адносна невысокая, тым не менш яны даюць доўгатэрміновае энергетычнае падсілкаванне, паляпшаюць страваванне, спрыяюць росту мышачнай тканкі. Гэта могуць быць арэхі, садавіна, ягады, гародніна, зерневыя булачкі.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць і на пітны рэжым. Ёсць меркаванне, што неабходна выпіваць два літры вады. Аднак, на думку спецыяліста, гэта зусім неабавязкова.

**Універсальныя правілы для тых, хто хоча развіць карысныя звычкі ў харчаванні і нармалізаваць сваю вагу.**

Самае галоўнае правіла — адмовіцца ад так званай «смеццевай» ежы: вэнджаніна, маянэз, газіроўка, чыпсы і ўсё тое, што мае насычаны і доўгі склад.

«Лепей выбіраць прадукты з максімальна кароткім складам, — гаворыць дыетолаг. — І памятайце, што на першым месцы ў складзе заўсёды пазначаны прадукт, які змяшчаецца ў найбольшай колькасці».

А вось падлік калорый як метад пахудзення, на думку спецыяліста, сыходзіць на другі план. Большую ўвагу лепш аддаваць якасці харчавання, а не колькасці. Хоць у некаторых выпадках, такіх як харчаванне спартсменаў пры падрыхтоўцы да спаборніцтваў, падлік калорый — рэч патрэбная.

Другім універсальным правілам спецыяліст лічыць разнастайнае харчаванне: «Калі адмовіцца ад вялікай колькасці салодкага, мучнога і салёнага, то рэцэптары ачышчаюцца, і чалавек пачынае адчуваць больш смакаў і атрымлівае большае задавальненне ад ежы. І, вядома, не грэбуйце зваротам да спецыяліста, калі сапраўды прынялі для сябе рашэнне зменшыць сваю вагу. Ён дапаможа правільна скласці адпаведны план харчавання і ўкараніць карысныя звычкі ў жыццё».

«Справа ў тым, што ёсць пэўныя супрацьпаказанні да павышанага пітнага рэжыму, — тлумачыць дыетолаг. — Варта ўлічваць, што, акрамя пітной вады, маюцца і іншыя крыніцы вадкасці, такія як садавіна, гародніна, супы. Важна ўлічваць і пару года.

У сярэднім аднаго літра дастаткова ў асенне-зімовы перыяд і паўтара — у вясенне-летні».

Чым больш гарачае і сухое паветра і актыўней фізічная нагрузкі, тым больш вадкасці расходуе арганізм. Галоўнае — не грэбаваць пачуццём смагі. Захацелася зрабіць глыток вады — абавязкова зрабіце. Але правіла «ўсё добра ў меру» працуе і тут. Залішняе спажыванне вады — гэта празмерная нагрузка на арганізм.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# Асцярожна: небяспечная флора

## Атрутныя расліны ў горадзе і на прыродзе: як засцерагчы сябе і дзяцей

**Летам гараджан цягне на прыроду: на дачу, у вёску да сваякоў ці проста ў паход з палаткамі. Сваёй прыродзе мы прывыклі давяраць, бо атрутныя расліны можна сустрэць толькі ў джунглях, а ў нашым умераным клімаце не расце нічога больш небяспечнага за крапіву. А вось і не! На лецішчы, падчас пікніку і нават у гарадскім парку можна сустрэць прадстаўнікоў айчыннай флоры, з якімі не варта мець справу.**

Мы спыталі ў **навуковага супрацоўніка лабараторыі інтрадукцыі і селекцыі арнаментальных раслін дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтральны батанічны сад Нацыянальнай акадэміі навук» Вольгі ДУБРОВАЙ,** якія атрутныя расліны растуць у нашай краіне і што рабіць, каб сустрэча з імі прайшла бяспечна.

### Воўчае лыка і вароніна вока

Пачнём са знакамітага *баршчэўніка,* пра які, безумоўна, і гараджане чулі. І ўсё ж баршчэўнік можна сустрэць не толькі там, дзе няма асфальту і шматпавярховых дамоў.

— У гарадах баршчэўніка няшмат — з ім актыўна змагаюцца. Але гэтая расліна дае велізарную колькасць насення, так што сустрэча з ім магчымая, — тлумачыць спецыяліст. — Расце баршчэўнік звычайна на пустках, у паніжаных вільготных месцах, любіць сяліцца ў пералеску, на ўскрайку лесу.

Сок баршчэўніка змяшчае рэчывы, якія, трапляючы на скуру, павялічваюць яе ўспрымальнасць да сонечных праменяў. І пасля гэтага на скуры ўзнікаюць моцныя апёкі. Праявіцца яны могуць не адразу, а на другі дзень. А яшчэ расліна здольная выклікаць моцную алергію — для гэтага дастаткова проста падыхаць парамі баршчэўніка. Калі баршчэўнікам апечана 80 % цела, магчымы нават лятальны зыход.

— Аматарам прагулак на прыродзе, а таксама тым, хто адпраўляецца ў лес па ягады-грыбы, варта звярнуць увагу, праз якія зараснікі яны пераходзяць з лесу ў лес, — кажа Вольга Дуброва.

Калі ёсць падазрэнне, што вы падвергліся ўздзеянню расліны, варта прамыць або працерці скуру вадой, змазаць яе супрацьапёкавым прэпаратам. Ну, а калі з'явіліся пухіры, зараз жа звярнуцца да ўрача.

*Воўчае лыка* — яшчэ адзін небяспечны прадстаўнік айчыннай флоры. Калі вы не распавялі сваім дзецям аб «ваўчынай ягадзе» — самы час зрабіць гэта менавіта цяпер. Прыгожы хмызняк квітнее бэзава-ружовымі кветкамі, якія неўзабаве ператворацца ў чырвоныя ягады, апетытныя на выгляд.

— Ягады вельмі прывабныя, і дзеці могуць прыняць іх за брусніцы, хоць сама расліна на брусніцы зусім не падобная, — распавядае суразмоўніца. — Ёсць яшчэ *«вароніна вока»* — таксама хмызняк з чорнымі ягадамі з шызым налётам. Ягада размяшчаецца паміж трох лісцікаў. Гэта таксама атрутная расліна.

Кветкі воўчага лыка маюць прыемны водар, але, удыхаючы яго, можна атрымаць моцны галаўны боль. А 5-6 з'едзеных ягад могуць стаць смяротнай дозай для дзіцяці або выклікаць цяжкае атручванне ў дарослага. Сімптомы — высыпанні, дыярэя, ваніты. Усе часткі воўчага лыка выклікаюць чырвань і пухіры, аж да некрозу тканак. Пры першых прыкметах атручвання варта прамыць страўнік і звярнуцца да ўрача не марудзячы.


Воўчае лыка.


Воўчае лыка.


«Вароніна вока».

### Дурман. Не любоўны

*Дурман звычайны* можна сустрэць на закінутых дачных і прысядзібных участках, на краі поля, за агародамі. А можна і на клумбе.

— Многія гатункі дурману выкарыстоўваюцца ў дэкаратыўным кветкаводстве, — расказвае Вольга Мікалаеўна. — Бо расліна вельмі прыгожая. Яе можна сустрэць і на гарадскіх кветніках, і ў парках, а кветкавыя


Дурман звычайны.

цэнтры прапануюць насенне гатункаў гэтай расліны з рознай афарбоўкай.

Вялікае разное лісце, буйныя кветкі і яркі пах — гэта і ёсць дурман.

— Калі вы панюхаеце кветку, нічога страшнага не будзе. Галоўнае — не рваць, не расціраць у руках лісце, не закладваць кветку дурману ў кнігу, каб засушыць.

Дурман можа выклікаць атручванне і адразу, і праз пятнаццаць гадзін. Сімптомы — пяршэнне ў горле, ваніты, сухасць у роце, павышаная ўзбуджальнасць і нават галюцынацыі. Дурман выклікае здранцвенне скуры твару, рук, ног, парушэнне сардэчнага рытму, пацямненне ў вачах і можа прывесці да вельмі сур'ёзных наступстваў.

*Багаткі (малачай)* — атрутная расліна, якую можна ўбачыць на падаконніках у розных установах. Але, нягледзячы на прывабны выгляд, багаткі небяспечныя.

— Ёсць віды гэтай расліны, у якіх сок вельмі таксічны, — кажа спецыяліст.

Змяшчаецца сок у сцябле і каранях. Ён выклікае апёкі Калі сок багатак трапіў на скуру, трэба старанна прамыць гэтае месца халоднай вадой, выпіць антыгістамінны сродак і звярнуцца да ўрача. Калі сок трапіў у вочы, неадкладна прамыйце іх і закапайце супрацьалергічныя кроплі для вачэй. І, зразумела, бягом да акуліста: сок багатак здольны выклікаць слепату.

*Балігалоў плямісты* — яго лісце вельмі нагадвае лісце пятрушкі або морквы. Пры гэтым у балігалову атрутныя ўсе часткі расліны.

— Балігаловам, бывае, атручваюцца нават бывалыя турысты, памылкова прыняўшы яго за пятрушку і дадаўшы ў суп. Праз гадзіну пасля ўжывання расліны ўзнікаюць галаўны боль, галавакружэнне, памутненне свядомасці, падкошваюцца ногі, зрэнкі пашыраюцца, перасыхае ў горле. Сімптомы атручвання балігаловам — страта прытомнасці і курчы. Лік ідзе літаральна на гадзіны, таму неадкладна прамыйце страўнік, выпіце актываваны вугаль і выклікайце «хуткую».

### Ландышы і іншая «рамантыка»

*Ландышы* сустракаюцца паўсюдна ў дэкаратыўным кветкаводстве і без усялякага ўдзелу чалавека растуць у лясах. Кветкі ландыша бяспечныя (хоць жаваць і камячыць у руках іх, зразумела, не варта), а вось ягадкі вельмі атрутныя. У іх утрымліваюцца сардэчныя гліказіды, то-бок яны здольныя выклікаць сур'ёзныя праблемы з сэрцам і нервовай сістэмай. Атруціўшыся ландышам,


Багаткі (малачай).


Балігалоў плямісты.

вы адчуеце галаўны боль, з'явіцца шум у вушах, брадыкардыя і курчы, звузяцца зрэнкі. Тэрмінова да ўрача!

Яшчэ адна атрутная расліна, аб якой складаюць песні, — гэта «люцікі-кветачкі», а дакладней — *казялец едкі.*

— Гэта небяспечная расліна смерці не выкліча, але можа стаць прычынай сур'ёзнага харчовага атручвання і слепаты.

*Беладонна* мае завостранае яйкападобнае лісце і буйныя кветкі. Што датычыцца пладоў, яны падобныя на вішню. Як распавяла суразмоўніца, гэтая расліна можа


Клешчавіна звычайная.


Аканіт.

сустрэцца ў калекцыях батанічных садоў, а таксама ў кветніках: кветкі беладонны выглядаюць досыць дэкаратыўна. У гэтай расліны атрутныя ўсе часткі, уключаючы плады. Можна нават атруціцца мёдам з пыльцы беладонны. Вельмі небяспечная расліна для дзяцей: усяго дзве ягады прыводзяць да вельмі сур'ёзных наступстваў. Сімптомы атручвання — агрэсія аж да стану шаленства, пашыраныя зрэнкі, сухасць слізістых носа і рота. Парушаецца зрок, чырванее твар, па целе ідзе сып, узнікаюць галюцынацыі, ваніты і панос, можа спыніцца сэрца. Неабходны неадкладны выклік хуткай дапамогі, а да яе прыезду важна прамыць страўнік, выпіць слаба завараны чай і актываваны вугаль.

*Клешчавіна звычайная* выкарыстоўваецца фармацэўтамі — з яе насення гатуюць касторавы алей. Але калі ўжыць у ежу насенне цалкам, гэта можа сур'ёзна нашкодзіць здароўю. Пры гэтым прыгожае разное лісце і плады ў выглядзе шарападобнай скрыначкі падабаюцца дзецям, таму так важна сачыць за малымі на прыродзе. Калі праглынуць насенне клешчавіны, з'явяцца энтэрыт, колікі, ваніты, крывацёк страўніка-кішачнага тракта, парушэнне водна-электралітнага балансу. Калі не праводзіць адпаведныя медыцынскія мерапрыемствы, магчымая нават смерць. Ды і пры своечасовай медыцынскай дапамозе страты здароўю будуць нанесены сур'ёзныя: рэчывы, што змяшчаюцца ў насенні клешчавіны, разбураюць бялкі жывых тканін.

*Аканіт* у натуральных умовах расце ўздоўж берагоў рэк і па абочынах дарог. Кветкаводы любяць яго за чароўныя фіялетавыя або цёмна-сінія кветкі. Але ўсе часткі расліны за выключэннем сцёблаў утрымліваюць атрутны алкалоід. Дастаткова пакратаць расліну, і яд выкліча запаленне скурных покрываў, а можа паўплываць і на работу сэрца. Дастаткова 4 мг яду аканіту, каб атруціцца да смерці. Самыя атрутныя часткі расліны — насенне і карані. Першыя прыкметы атручвання — млоснасць, ваніты, адышка, галаўны боль, слінацячэнне і збытанасць свядомасці. Дапамога патрэбная неадкладна, праз дзве гадзіны можа быць позна. Прамыйце страўнік пацярпелага і выклікайце хуткую дапамогу.

### Не чапай — і не атрымаеш здачы

— У прыродзе шмат атрутных раслін, — распавядае Вольга Дуброва. — Каб пазбавіцца ад іх, прыйшлося б знішчыць значную частку флоры. З навуковага пункту гледжання, гэта ўсяго толькі спосаб раслін абараніцца ад траўміравання, паядання жывёламі і насякомымі. Таму не чапай — і не атрымаеш здачы. Проста атрымлівайце асалоду ад далікатнай прыгажосці і разнастайнасці нашай прыроды.

Выходзячы ў гарадскі парк або выязджаючы на прыроду, мы любім часам сарваць травінку, каб пажаваць яе ці пацерці ў руках. Калі незнаёмая расліна адносіцца да сямейства злакавых (гэта можа вызначыць


Беладонна.


Казялец едкі.

нават чалавек, чые зносіны з прыродай абмяжоўваюцца праглядам канала «National Geographic»), хутчэй за ўсё, ніякіх наступстваў для здароўя не будзе — злакавыя не валодаюць таксічнымі ўласцівасцямі, кажа спецыяліст. Але ў цэлым важна самім з асцярожнасцю ставіцца да незнаёмых раслін і вучыць гэтаму дзяцей.

— Не трэба рваць і тым больш спрабаваць на смак незнаёмыя расліны, — падкрэслівае суразмоўніца. — Беражлівае стаўленне да навакольнага асяроддзя, па-першае, зберажэ флору, бо многія атрутныя расліны занесены ў Чырвоную кнігу, адносяцца да рэдкіх і знікаючых відаў. А па-другое, захавае ваша здароўе. Ну, і не лішнім будзе, рыхтуючыся да турыстычнага паходу, азнаёміцца ў інтэрнэце з тым, як выглядаюць атрутныя прадстаўнікі нашай флоры, каб абысці іх.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# СВЕТ НА ДРОЦЕ




## Чаму гіганцкі апоўзень каля берагоў Афрыкі «паклаў» інтэрнэт?

**Днямі міжнародная група навукоўцаў паведаміла аб наймагутнейшым сходзе падводнай лавіны з усіх, за якімі акіянаграфам даводзілася назіраць. Гэта адбылося ў падводным каньёне, які пачынаецца ад вусця ракі Конга каля ўзбярэжжа Заходняй Афрыкі, паведаміла The Guardian. З'ява была зафіксавана яшчэ ў студзені мінулага года, аднак спецыялістам спатрэбілася многа часу, каб аднавіць пашкоджаную велізарным падводным апоўзнем апаратуру і апрацаваць неабходныя даныя. Разам з акіянаграфічным інвентаром была пашкоджана сістэма падводных камунікацый, якая адказвае за перадачу 99 працэнтаў усіх даных у свеце. Наколькі абаронена «глабальнае павуцінне»?**

### ЛАВІНА Ў КАНЬЁНЕ

На дне Сусветнага акіяна ёсць мноства падводных каньёнаў. Упадзіна, якая пачынаецца каля вусця ракі Конга, дзе адбыўся сход, — адна з найбуйнейшых на планеце. Звычайна гэта V-падобная шчыліна, глыбіня якой складае тысячу і больш метраў адносна дна. Вымяраць хуткасць руху наносаў і іх масу дапамагае спецыяльнае абсталяванне, пракладзенае па ўсёй даўжыні каньёна. З дапамогай падобных прыбораў навукоўцы могуць назіраць за падводнымі з'явамі і ацэньваць звязаныя з імі рызыкі і для жыццядзейнасці чалавека.

Надзвычайная прыродная з'ява на ўзбярэжжы Чорнага кантынента працягвалася два дні і ахапіла плошчу, якая перавышае 1,1 тысячы кіламетраў дна Атлантычнага акіяна. «Пацярпелі некалькі нашых акіянаграфічных станцый, іх літаральна сарвала з якара, якім яны мацуюцца да дна. З іх мы атрымалі электроннае паведамленне аб тым, што адбываецца», — паведаміў прафесар Дарэмскага ўніверсітэта Пітэр Толінг. На глыбіню каньёна сышло больш за адзін кубічны кіламетр (!) пяску і бруду.

На думку навукоўцаў, рух магутнага патоку справакавалі два фактары. Перш за ўсё гэта выключна моцная паводка ў рацэ Конга ў снежні 2019 года, прыкладна за два тыдні да пачатку руху падводнай масы. Такія катаклізмы здараюцца прыкладна раз у паўстагоддзя і прыносяць у вусце ракі вялікія аб'ёмы пяску і бруду. Як заўважаюць спецыялісты, падчас паводкі 2019-га вада ў басейне ракі Конга прыбывала з хуткасцю 70 тысяч кубаметраў за секунду.

Пасля, у студзені мінулага года, пачаліся незвычайна моцныя прылівы і адлівы. «Мы думаем, што рух масы пачаўся на пліткаводдзі, падчас адліву, — адзначыў прафесар Дэн Парсанс з Універсітэта Хала. — Па меры таго як зніжаецца нагрузка на акіян у яго верхніх пластах, змяняецца ціск у донных адкладах, што і прыводзіць да такіх наступстваў».

### ТРАФІК НА 10 ТРЫЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

Гэтая з'ява не атрымала б такога шырокага рэзанансу, калі б лавіна не абарвала два падводныя камунікацыйныя кабелі, што парушыла работу інтэрнэту на ўсёй тэрыторыі паміж Нігерыяй і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай.

У водах Сусветнага акіяна пастаянна курсіруюць спецыяльныя караблі, яны гатовы хутка ліквідаваць паломкі ў сістэме падводных камунікацый, якая стала жыццёва неабходнай. Рамонтнае судна The Leon Thevenin было накіравана да берагоў Заходняй Афрыкі, каб аднавіць кабелі, якія былі абарваныя падводнай лавінай. Неабходныя работы працягваліся некалькі тыдняў.

Навукоўцы, якія вывучалі здарэнне каля Афрыкі, заявілі, што іх работа ўяўляе сабой першае падрабязнае даследаванне магутных падводных мутных плыняў. Яны могуць зруйнаваць падводныя камунікацыі, па якіх перадаецца больш за 99 працэнтаў глабальнага трафіку даных паміж кантынентамі. Гэта датычыцца інтэрнэту, электроннага гандлю, воблачнага



захавання даных і паслуг галасавой пошты. Маштабы глабальнага трафіку насамрэч уражваюць: паводле звестак Policy Exchange, адных толькі грашовых пераводаў па ўсім свеце штодня ажыццяўляецца на 10 трыльёнаў долараў.

Даследаванне афрыканскай падводнай лавіны можа дапамагчы падчас планавання маршруту пракладвання падводных камунікацый, а таксама спрыяць рацыянальнаму размяшчэнню рамонтных суднаў і пошуку спосабаў змякчэння наступстваў надзвычайных здарэнняў. «Гэтыя новыя даныя будуць выкарыстаны ў індустрыі камунікацый, з іх дапамогай пракладуць новыя маршруты па дне акіяна ў абыход раёнаў з найбольшай рызыкай узнікнення эрозій, пагібельных для тэхнікі», — заўважыў спецыяліст у галіне марской геалогіі брытанскага Нацыянальнага цэнтра акіянаграфіі Майк Клэр.

### ПРЫНАДА ДЛЯ АКУЛ

Уся наша планета шчыльна ахоплена кабелямі сувязі. Як вядома, інтэрнэт — гэта сетка звязаных паміж сабой сетак. У агульных рысах сістэма сувязяў падобная на дрэва. Ролю «ствала» адыгрываюць тоўстыя кабелі з оптавалакна, якія знаходзяцца пад зямлёй і на дне акіяна. Яны звязваюць паміж сабой краіны і нават асобныя кантыненты. Размяшчэнне такіх кабеляў лёгка знайсці ў адкрытым доступе. Ёсць нават інтэрактыўная карта, на якой можна паглядзець, якімі шляхамі кантэнт перамяшчаецца праз акіяны. Праект TeleGeography адсочвае пракладку падводных камунікацый з 1999 года.

З таго часу як на фондавых біржах былі ўведзены аўтаматызаваныя сістэмы гандлю, а здзелкі пачалі здзяйсняць камп'ютары, тэрмін для прыняцця рашэння зменшыўся да мікрасекундаў. Гэта запатрабавала адпаведнага павелічэння хуткасці сувязі. Амерыканская кампанія Hibernia Atlantic інвесціравала 300 мільёнаў долараў у пракладку новага кабеля Hibernia Express паміж Лонданам і Нью-Ёркам. Дзякуючы яго запуску ў 2015 годзе затрымка ў аперацыях складае ўсяго 58,95 мілісекунды.

Калі вы хочаце паглядзець, якім бы быў інтэрнэт без падводных кабеляў, наведайце Антарктыду — адзіны кантынент, які не мае фізічнага падключэння да Сеткі. Мясцовыя даследчыя станцыі залежаць ад спадарожнікаў з высокай прапускной здольнасцю, але нават гэтай магутнасці не хапае, каб перадаць усе даныя.

Размяшчэнне кабеляў выразна паказана на марскіх картах і ў навігацыйных сістэмах. Гэта зроблена для таго, каб караблі выпадкова не пашкодзілі камунікацыі. Па словах прадстаўніка брытанскай тэлекамунікацыйнай кампаніі «Джэй Ці», на картах пазначаны месцы, дзе кідаць якар забаронена. Гэтая мера дазваляе засцерагчы інтэрнэт-камунікацыі і пазбегнуць аварыйных адключэнняў. Праўда, і тут не абыходзіцца без недарэчнасцяў. Так, у 2016 годзе карабельныя якары разарвалі тры кабелі паміж Нармандскімі астравамі і брытанскім узбярэжжам. Гэта выклікала перабоі з інтэрнэтам і адключэнне мабільнай сувязі.

Апроч караблёў, кабелям пагражаюць таксама рыбацкія сеткі, прыродныя катастрофы і нават акулы. Гэтыя драпежныя рыбы чамусьці ўпадабалі падводныя камунікацыі. Марскія біёлагі мяркуюць, што драпежнікі прымаюць кабель за здабычу, таму і нападаюць. Абараняючыся ад акул, буйныя кампаніі, такія як Google, пакрываюць свае камунікацыі пластом ахоўнага кеўлару.

Часам кабелі выходзяць са строю па прычыне прыродных катастроф. Напрыклад, у 2012 годзе ўраган «Сэндзі» пашкодзіў большасць кабеляў, якія знаходзяцца ў Нью-Ёрку і Нью-Джэрсі — асноўных пунктах выхаду падводных камунікацый на бераг. У выніку інтэрнэт-злучэнне паміж Паўночнай Амерыкай і Еўропай адсутнічала некалькіх гадзін.

Кабелі не так проста перарэзаць, але часам і гэта адбываецца. У 2013 годзе ў Егіпце, недалёка ад Александрыі, былі затрыманы некалькі зламыснікаў у аквалангах. Высветлілася, што яны наўмысна перарэзалі падводны кабель даўжынёй 20 тысяч кіламетраў, які злучае тры кантыненты.

### ВАЙНА ЗА «ВОБЛАКА»

Некаторыя кабелі звязваюць суседнія краіны, як 131-кіламетровы CeltixConnect паміж Ірландыяй і Злучаным Каралеўствам. Іншыя, як Азіяцка-Амерыканскі Gateway, цягнуцца на 20 тысяч кіламетраў і звязваюць кантыненты. Даныя ідуць праз аптычныя валокны таўшчынёй у чалавечы валасок. Кабель уяўляе сабой пучок такіх валокнаў, змешчаных у ахоўную абалонку.

Па словах Даніэля Соўзы, кіраўніка дырэктара па вытворчасці ў амерыканскай кампаніі SubCom, якая займаецца падводнымі тэлекамунікацыямі, адна з цяжкасцяў у тым, што кабельныя сістэмы павінны вырабляцца і выпрабоўвацца як адно цэлае. Тэсціраванне праводзіцца на беразе перад пагрузкай кабеля на карабель і займае каля двух тыдняў, заўважыў «Бі-бі-сі» кіраўнік кампаніі Orange Marine Дыдзье Дылар. Гэтая фірма валодае шасцю адмысловымі судамі, адно з якіх, «Рэнэ Дэкарт», здольна пракласці шэсць тысяч кіламетраў кабеля.

Раней асноўнымі заказчыкамі гэтых складаных і дарагіх праектаў былі тэлекамунікацыйныя кампаніі. Зараз у іх пачалі сур'ёзна ўкладваць гіганты хайтэку. Па звестках TeleGeography, асноўныя сусветныя вытворцы інтэрнэт-кантэнту — Google, Facebook, Amazon і Microsoft — за апошнія пяць гадоў інвесціравалі ў пракладку падводных кабеляў больш за паўтара мільярда долараў.

Google робіць стаўку на ўласныя кабелі. Кабель «Кюры» звязаў Чылі са Злучанымі Штатамі, а пабудаваны ў партнёрстве з SubCom «Дзюнан» — Амерыку і Францыю праз прыбярэжную станцыю кампаніі Orange Marine ў Сэнт-Ілер-дэ-Рэц. Хутка ўвядуць у эксплуатацыю яшчэ два кабелі: «Эквіяна» пойдзе з Партугаліі ўздоўж заходніх берагоў Афрыкі ў ПАР, а «Грэйс Хопер» звяжа ЗША, Брытанію і Іспанію. Павышэнне надзейнасці доступу да інтэрнэту і яго распаўсюджванне на раней неахопленых тэрыторыях — дзве асноўныя прычыны для значных капіталаўкладанняў.

Гэта таксама інвестыцыя Google ва ўласныя інтэрактыўныя сэрвісы. У гэтай галіне канкурэнцыя асабліва моцная, што дала падставу назіральнікам казаць аб «воблачнай вайне» паміж інтэрнэт-гігантамі за дамінаванне. Гэтыя тэхналогіі ператварыліся ў велізарны бізнес па меры таго, як кампаніі пачалі пераносіць свае сховішчы лічбавых даных у такія сэрвісы, як Amazon AWS і Azure ад Microsoft.

### «ФУРЫ» І «ЛЕГКАВІКІ»

Дырэктар па даследаваннях кансалтынгавай кампаніі TeleGeography Алан Молдзін заўважыў «Бі-бі-сі», што кабелі могуць быць прыватнымі, але ні ў кога няма выключнага права карыстацца імі: «Карыстальнікі шматлікія, і ўсе выкарыстоўваюць адну і тую ж інфраструктуру». Google не гандлюе доступам да сваіх кабеляў наўпрост, але вылучэнне часткі ёмістасці тэлекамунікацыйным кампаніям — распаўсюджаная практыка. Напрыклад, Orange Marine дае сваім кліентам доступ да кабеля «Дзюнан», наўзамен дазваляючы Google выкарыстоўваць яе станцыю ў Сэнт-Ілер-дэ-Рэц. Алан Молдзін параўноўвае падземныя кабелі з аўтастрадай: Google і Facebook — гэта «фуры», але па аўтастрадзе ездзяць і «легкавікі», дастаўляючы даныя сваім кліентам.

Размовы пра тое, што спадарожнікі з часам выцісняць падводныя кабелі, ідуць дзесяцігоддзямі. Кампанія OneWeb са штаб-кватэрай у Лондане нядаўна запусціла шостую партыю сваіх спадарожнікаў. SpaceX Ілона Маска інвесціруе ў тэхналогіі спадарожнікавай сувязі ў рамках яе праекта Starlink. Аднак, як лічаць спецыялісты, параўноўваць гэтыя два віды сувязі нельга. Спадарожнікі найбольш эфектыўныя ў аддаленых месцах Зямлі, куды фізічна цяжка ці нявыгадна пракласці кабелі. Але апошнія незаменныя для перадачы вялікіх масіваў даных. «Асноўная работа па абмене вялікімі аб'ёмамі даных паміж сховішчамі па ўсім свеце будзе выконвацца падводнымі кабелямі», — упэўнены Алан Молдзін. Апора на акіянскія камунікацыі мае геапалітычны аспект.

І яшчэ. Як высветлілася, адзін з найсур'ёзнейшых у гісторыі інтэрнэту збой, які здарыўся днямі, выклікала памылка ў праграмным забеспячэнні амерыканскага правайдара паслуг па «воблачным доступе» Fastly. Мноства інтэрнэт-сайтаў па ўсім свеце, уключаючы брытанскі ўрад, вядучыя СМІ — ад CNN і New York Times да Guardian і «Бі-бі-сі» — аказаліся недаступнымі або працавалі з цяжкімі перабоямі з-за таго, што нейкі карыстальнік, не здагадваючыся аб наступствах, змяніў параметры і тым самым актываваў глабальны сістэмны збой. Па іроніі лёсу гэты чалавек міжволі аказаўся мацнейшы па наступствах за афрыканскі падводны апоўзень.

Захар БУРАК.

# Извещение о проведении 23 июня 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

**Предмет торгов**

Капитальное строение (подземное битумохранилище) с инв. № 631/С-59042, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно технического паспорта на сооружение от 16.05.2018 года б/н составленному по состоянию на 25.05.2009 года;
капитальное строение (водопроводная сеть) с инв. № 631/С-58995, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: водопроводная сеть, протяженностью 175,6 м, состоящая из напорного трубопровода, колодца, артезианской скважины, водонапорной башни;
капитальное строение (производственно-бытовой корпус) с инв. № 631/С-12108 общей площадью 308,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание производственно-бытового корпуса, с пристройкой, асфальтобетонной площадкой, тремя ограждениями (с воротами и столбами);
капитальное строение (гудронохранилище) с инв. № 631/С-59045, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: гудронохранилище объемом 2061 м куб.;
капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59044, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 948 м куб.;
капитальное строение (дегтехранилище) с инв. № 631/С-59043, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: дегтехранилище объемом 648 м куб.;
капитальное строение (здание весовой, проходной) с инв. № 631/С-12106 общей площадью 81,0 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой, проходной;
капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58979 общей площадью 110,1 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание склада с пристройкой;
капитальное строение (котельная) с инв. № 631/С-12107 общей площадью 102,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание котельной с пристройкой;
капитальное строение (трансформаторная подстанция) с инв. № 631/С-58986 общей площадью 57,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции;
капитальное строение (склад) с инв. № 631/С-58980 общей площадью 65,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное здание склада;
капитальное строение (компрессорная) с инв. № 631/С-58981 общей площадью 81,4 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание компрессорной с пристройкой, тремя емкостями;
капитальное строение (электроцех) с инв. № 631/С-58982 общей площадью 39,7 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание электроцеха;
капитальное строение (паропровод) с инв. № 631/С-58987, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной паропровод протяженностью 184,8 кв. м, состоящий из двух участков;
капитальное строение (битумопровод) с инв. № 631/С-58989, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: наземный, стальной, битумопровод диаметром 75 мм, протяженность – 201 м;
капитальное строение (мазутопровод) с инв. № 631/С-58988, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно технического паспорта на сооружение от 16.05.2018 года б/н составленному по состоянию на 16.06.2009 года;
капитальное строение (канализационная сеть) с инв. № 631/С-58990, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная канализационная сеть протяженностью 108 м, состоит из двух участков и четырех колодцев;
капитальное строение (линия электропередачи) с инв. № 631/С-58992, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: подземная линия электропередачи протяженностью 646,6 м, напряжением 04 кВ., состоящая из четырех участков;
капитальное строение (линия наружного освещения) с инв. № 631/С-58993, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: линия наружного освещения протяженностью 19,7 кв. м, напряжением 0,4 кВ., способ прокладки – подземный, состоит из двух участков и двух мачт;
капитальное строение (сеть газопровода) с инв. № 631/С-65180 общей площадью 259,5 кв. м, включающее в себя следующие составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно технического паспорта на сооружение от 23.02.2018 года б/н, составленному по состоянию на 22.02.2018 г. Молодечненским филиалом РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;
узел учета газа, инвентарный номер 1372; установка докотловой обработки воды, инвентарный номер 940;
резервуар Р 2500000, инвентарный номер 402; резервуар Р-25, инвентарный номер 410; емкость металлическая, инвентарный номер 201; трансформатор ТМ 630/10, инвентарный номер 678; емкости, инвентарный номер 657; емкости, инвентарный номер 658; комплект системы управления «Альфа-П», инвентарный номер 670; комплект системы управления «Альфа-П», инвентарный номер 671; котлоагрегат, инвентарный номер 693; котел Е 1/9, инвентарный номер 695; котел чугунный водогрейный, инвентарный номер 712; модуль подогрева топлива БСТ-МПТ-12-2, инвентарный номер 715

Сведения о земельных участках: площадь – 1,5355 га, кадастровый номер – 621350100001000310; площадь – 4,6829 га, кадастровый номер – 621350100004000541

Местонахождение: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Волкова, 43

Начальная цена: 286 988,30 бел. руб. без учета НДС

Сумма задатка: 28 600,00 бел. руб.

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **23 июня 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.06.2021 по 21.06.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21; (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 15.07.2021 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

**Лот № 1**. Единый объект недвижимого имущества в составе: 51/100 доли капитального строения с инвентарным номером 632/С-10324 общей площадью 105,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, г. Воложин, ул. Казинца, 1. Назначение: здание блокированного жилого дома; наименование: жилой дом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622050100075000003 площадью 0,1183 га. **Начальная цена продажи – 8 316,00 бел. рублей, задаток – 831,60 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Изолированное помещение с инвентарным номером 200/D-106468 общей площадью 757,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. М. Горького, 72-2ж. Назначение: административное помещение; наименование: административное помещение. **Начальная цена продажи – 92 160,00 бел. рублей, размер задатка – 9 216,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Изолированное помещение с инвентарным номером 411/D-887 общей площадью 63,2 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Берестовицкий р-н, г. п. Большая Берестовица, ул. Советская, д. 29-5. Назначение: квартира 4 01 01; наименование: квартира № 5. **Начальная цена продажи – 11 592,00 бел. рублей, задаток – 1 159,20 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-46434 общей площадью 474,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Янки Купалы, 102. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Наименование: складские помещения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001003339 площадью 0,4445 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 105 912,92 бел. рублей, задаток – 10 591,29 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5**. Единый объект недвижимого имущества в составе:

1. Капитальное строение с инвентарным номером 340/С-306963 общей площадью 496,0 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский район, г. п. Лоев, ул. Ленина, д. 84Б, корп. 1. Назначение: здание специализированное иного назначения. Наименование: навес № 2.

2. Капитальное строение с инвентарным номером 340/С-306964 общей площадью 492,8 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Лоевский район, г. п. Лоев, ул. Ленина, д. 84Б, корп. 2. Назначение: здание специализированное иного назначения. Наименование: навес на 7 комбайнов.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 323055100001002616 площадью 3,0059 га (право постоянного пользования).

**Начальная цена продажи – 77 904,00 бел. рублей, задаток – 7 790,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27566 общей площадью 788,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Ленина, д. 145. Назначение: здание специализированное для общественного питания. Наименование: столовая № 5. Составные части и принадлежности: столовая № 5(А1/к) с пристройкой (Б1/к), пристройкой В1/бл, пристройкой Г1/к, теневым навесом, холодной пристройкой, складом, гаражом, складом, сараем, двумя навесами. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 624650100001006161 площадью 0,4158 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 722 304,00 бел. рублей, задаток – 72 230,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-57235 общей площадью 353,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Вилейский район, г. Вилейка, пер. Гидростроителей, д. 10. Назначение: здание специализированное для производства строительных материалов; наименование: бетонно-смесительный узел. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 621350100005000935 площадью 9,7128 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 24 550,94 бел. рублей, задаток – 2 455,09 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

